Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960 NR INDEKSU 366714

АЛЯКСАНДР МІЛІНКЕВІЧ ☞ 8

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 15 (2604) Год LI | Беласток, 9 красавіка 2006 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА



Перападлік Андрасюка

Прэзентацыя кніжкі „Белы конь” была нагодай для чарговай сустрэчы з Міхасём Андрасюком, якую 30 сакавіка наладзіла Наталля Герасімюк у Музеі і асяродку беларускай культуры ў Гайнаўцы ў рамках праекта „Забытых таямніцаў чар”. Гайнавяне і грамадзяне Беларусі, якія жывуць на ўскраіне Белавежскай пушчы (і якія прымалі ўдзел у праекце), цікавіліся новымі апавяданнямі гайнаўскага празаіка і журналіста. Ставілі яны шмат пытанняў наконт варштату працы аўтара і герояў новай кніжкі, якую выдала Беларускае літаратурнае аб'яднанне „Белавежа”.

— У кніжцы хацеў я развітацца з пэўнымі справамі, успамінамі і зрабіць перападлік у маім жыцці. Гэтае выданне адрозніваецца ад маіх ранейшых кніжак і думаю, што больш такога не напішу, — заявіў Міхась Андрасюк у пачатку спаткання.

Аўтар паінфармаваў, што самы стары твор пра жанчыну з маленькага мястэчка ўзнік яшчэ ў 2000 годзе, але большасць апавяданняў змешчаных у кніжцы напісаў ён апошнім часам.

— Гэтае выданне пра польска-беларускае памежжа, тутэйшасць, мяжу і маіх продкаў, — сказаў Міхась Андрасюк і адразу дадаў, што вельмі мала ў ёй аўтабіяграфічных дэталяў з жыцця сям'і і знаёмых.

Вядучая спатканне Наталля Герасімюк заявіла, што ў асоб, прачытаўшых кніжку да яе прэзентацыі, паявіліся мяшаныя адчуванні наконт новых твораў Міхася Андрасюка. Чытачы пахвалілі празаіка за сакавітасць мовы і папракнулі за змест, у якім жыццё ў Гайнаўцы паказана з крытычнай афарбоўкай.

— Калі я пішу чарговы твор, не думаю ці пішу добра, ці дрэнна і ацэнку пакідаю іншым. Важна, каб чытач, прачытаўшы некалькі абзацаў, сказаў: гэта напісаў Андрасюк, — тлумачыў герой спаткання.

Сабраныя ў выставачнай зале музея ставілі аўтару кніжкі шмат пытанняў. Цікавіліся, між іншым, інспірацыямі, якія схілілі аўтара да апісання мяжы і памежнага жыцця.

— Паездка на прыгранічную тэрыторыю ў Беларусь дала магчымасць глянуць на тыя месцы, якія я ўяўляў па-свойму, на падставе расказаў сямейнікаў і вяскоўцаў. Раней я лепш ведаў Мінск і Гродна, чым вёскі распаложаныя за граніцай, побач майго роднага сяла, — гаварыў Міхась Андрасюк.

Удзельнікі спаткання выказваліся наконт прачытанай кніжкі.

— Варта было аддаць талент простым справам і словам. У кніжцы знаходзім набілітацыю звычайнага асяроддзя. Добра, што далі вы мастацкую афарбоўку звычайным справам, — заявіла старэйшая жанчына.

— Калі напішу наступную кніжку, будуць у ёй паказаны мястэчка і свет бачаныя вачыма чыгуначнага білецёра. Чалавек гэты працуе на чыгунцы, прадае білеты і бачыць свет вачыма пасажыраў, а тое, чаго не бачыць, уяўляе сабе, — заявіў герой сустрэчы і зачытаў, упершыню публічна, фрагмент новай кніжкі.

— Калі я пачынаю пісаць, некалькі тыдняў або месяц жыву жыццём сваіх герояў. Думаю, што Коля зрабіў бы або сказаў бы ў акрэсленых умовах. Я стараюся пераняць думкі сваіх герояў. Гляджу на чалавека і гадаю, што ён можа думаць, каб магчы перанесці яго мыслі на паперу, — гаварыў аўтар „Белага каня”.

Сабраныя дапытваліся ці героі ўзяты з гайнаўскага жыцця або наваколля.

— Малы Сашка — гэта гайнаўская постаць, але ад яе ўзяты толькі адзін эпізод, штуршок. Ён як губка, увабраў у сябе прыкметы розных людзей. Так і іншыя мае героі ўвасабляюць у сабе многія постаці, — сказаў аўтар.

Пасля спаткання з гайнаўскім празаікам перад сабранымі выступіў акцёр Гродзенскага лялечнага тэатра, бард Віктар Шалкевіч. Побач бардаўскіх песень, якія выконваў пад гітару, прачытаў ён свой тэкст „Інтэлігенцыя і народ”, у якім з мастацкім ухілам даў ацэнку працэсам, якія апошнім часам адбываюцца ў Беларусі.

Аляксей Мароз

Наш космас ☞ 2

Аляксандр Вярбіцкі

Але чаму жыхар вёскі асацыюе гарадскіх студэнтаў з запраганнем у хамут? Бо вясковец мае свой космас, у якім не знаходзіць студэнтам іншага месца; аказваецца, што мой суразмоўца не мае нават выдуманага гараджанамі трактара. Ён думае паводле старых вясковых разумовых матрыц, дзе ўсё яшчэ няма месца для гарадскіх выдумак...

Іншая Беларусь ☞ 2

Уладзімір Хільмановіч

Хіба ніколі ў гісторыі Беларусі такая колькасць вернікаў не малілася за сваю краіну, за свабоду. Беларусы ў сакавіцкіх падзеях выявілі сябе як люд хрысціянскі, люд цывілізаваны. Сотні людзей былі кінуты за краты, некаторыя дагэтуль сядзяць пад адміністрацыйным арыштам ці следствам па высмактаных з пальца крымінальных справах. Але „зварушаны нарэшце дух народны”...

Гаспадар ☞ 4

Аляксей Мароз

У мінулым не было ў нас беспрацоўя. Толькі пры перавалцы грузаў на граніцы з Беларуссю занятых было каля 800 асоб. Хаця апошнім часам паяўляліся новыя месцы працы, то многа маладых людзей надалей не можа знайсці работу. Найцяжэй знайсці працу асобам з вышэйшай адукацыяй. У школе і гімназіі ўстанове ёсць ужо працаўнікі. Хаця лягчэй знайсці работу рабочым, то сярод людзей з прафесійнай адукацыяй таксама ёсць беспрацоўныя...

Сустрэча Буйнюка ☞ 9

Ірэна Ігнатовіч

Чытаючы вершы і аглядаючы здымкі маладога хлопца з Маліннік, мы рашылі з ім пазнаёміцца і запрасілі яго ў сваю школу. Наш госць запрашэнне прыняў. 20 сакавіка з самай раніцы з вялікім хваляваннем прыехаў у Гайнаўскі белліцэй...

Нашы яўрэі ☞ 11

Марк Цыбарт

Ва ўсходняй частцы рэгіёна найбольш яўрэяў жыло ў Орлі (3 000 жыхароў і „амаль усе — яўрэі”), Сямятычах (4 200 яўрэяў на 7 800 усяго насельніцтва), Бельску-Падляшскім (38% яўрэяў на 8 000 насельніцтва) і Свіслачы (2 100 яўрэяў на 4 000 жыхароў). Але самы цікавы матэрыял пра гэтую нацыянальную меншасць змяшчаецца пры апісанні „шматлюдна наведванага лецішча” Мілейчычы...

9 770546 196000

Наш космас

Часта людзі ставяць мне закід, што „Ніва” празмерна захапляецца палітыкай. Але ж вельмі часта мае нашы суразмоўцы, як начныя матылі да агню, як Ванька-ўстанька на „ногі”, як за нейкім магнітам горнуцца менавіта да палітыкі.

У апошні час на палітычную перадавую выйшла Беларусь і яна становіцца цэнтрам нашага шматлікага асабістага космасу. Становіцца сонейкам, якое цёплым святлом абагравае іншых.

— Унукі майго брата, — завяршае свае жыццёвыя назіранні пажылы вясковец з Сукавіч, — жывуць у Данбасе. Цяпер, калі на Украіне стаў правіць Юшчанка, яны пішуць брацісе, якая жыве ў Ваўкавыску, ліст і просяць, каб яна ім хаця нешта напісала, каб чытаючы той ліст адчулі хаця пах хлеба.

Значыць, на Украіне хлеба няма. А там зямля ж такая-такая! І выснова, што няма там папросту добрага ўладара. І выснова, што добры ўладар там, дзе нават ліст насычаны пахам хлеба.

Прыгадваю сабе аднаго колішняга хлопца з Альхоўкі, якога ў разгары нашарайскай геркаўскай эпохі выкідалі з кожнай працы за лодырства і злодзейства. І ён пісаў сваякам у Амерыку, што ў нас тут страшэнная бяда, што, мабыць, нават хлеба немагчыма панюхаць. І тыя добрыя людзі, мабыць праклінаючы нашага любімага Герка, пасылалі гаротніку амерыканскія грошы. А ён за тыя долары валяўся то ўздоўж, то ўпоперак дарогі з рэстаранай Нараўкі ў хатнюю Альхоўку.

Прабіваюся праз ледавіты сівер з Сукавіч у Шудзялава. Даганяе мяне чалавек на конным возе і запрашае прысесціся. Воз, гэта не выдуманы гараджанамі самаход, дзе чалавек закрыты ў клетцы быццам у гарадской кватэры. З воза чалавек не траціць кантакту з прыродай, з конскім пахам, з другім чалавекам. Фурман пазнае мяне, бо пару дзён раней бачыў мяне ў сваёй Слоі. Я аднекваюся, каб седзячы на возе яшчэ больш не мерзнуць. Але вазак не ўступае:

— Я толькі на хвіліну затрымаюся, высцуся, і паедзем.

Афарміўшы сваю справу пад воз ён паганяе каня і аднаўляе запрашэнне, а я ўступаю, лезу на воз, бо і невядома, ці яшчэ калі-небудзь здарыцца такая нагода. І слухаю нараканне падмацаванае рахункаводствам:

— Калісь для куплі трох тон мінугнаенняў хапала адкарміць аднаго вепрука, а сёння трэба тры вепрукі. Калісь пару гумавых ботаў можна было купіць за метр збожжа, сёння трэба паўтара метра. Так жывецца ў Польшчы. А ў Беларусі, як былі дажынкі, якія трактары паказалі! У Польшчы паказвалі тады, як Кваснеўскі Глемпу якуюсь булачку даў. І чаго тыя студэнты ў Беларусі яшчэ хочуць? Ці Лукашэнка іх араць запрагае?!

А я не ведаю, што адказаць свайму вясковаму дабрадзею. Ці гаварыць, што мінугнаенні выдумалі гараджане дзеля таго, каб патаннелі купляемыя імі сельскагаспадарчыя прадукты. І не ведаю, ці Лукашэнкавы апаненты абяцалі запрагаць студэнтаў у ярмо. І чаму ў натрактаранай Беларусі студэнты ўсё яшчэ падбіраюць бульбу ў любімых Лукашэнкам калгасах.

Але чаму жыхар вёскі асацыюе гарадскіх студэнтаў з запраганнем у хамут? Бо вясковец мае свой космас, у якім не знаходзіць студэнтам іншага месца; аказваецца, што мой суразмоўца не мае нават выдуманага гараджанамі трактара. Ён думае паводле старых вясковых разумовых матрыц, дзе ўсё яшчэ няма месца для гарадскіх выдумак. Няма там месца і для прыдуманай старажытнагрэчаскімі гараджанамі дэмакратыі. І так, мяркую, думаюць многія беларусы, ураджэнцы вёскі, нават калі яны перасяліліся ў гарады. Ну, мо адзіным атрыбутам лепшага, гарадскога, беларускага самаадчування становіцца адрачэнне ад „деревенщины”, ад бацькоўскай мовы. Ці ж у гэтым плане Лукашэнка не запрагае свайго калгаса быць „гараджанамі”?

У 1952 годзе ў Заходняй Германіі было праведзена апытанне, які грамадскі строй немцы лічаць найлепшым. Амаль палова (45%) назвала кайзераўскі парадак, крыху менш (42%) гітлераўскі; за ўводзімую тады там англічанамі і амерыканцамі дэмакратыю выказалася толькі два (!) працэнты рэспандэнтаў. Чарговае апытанне было праведзена ў 1972 годзе, праз адно пакаленне, калі адышлі прывяржэнцы старога, а прыйшлі новыя людзі: за дэмакратыю выказалася 90% апытаных.

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Іншая Беларусь

„Брацця! Ці зможам грамадскае гора?! Брацця, ці хваце нам сілы?!” У цяжкі для Бацькаўшчыны час (а ці быў калі іншы?) наш класік Максім Багдановіч зноў актуальны, зноў патрэбны, зноў спаталяе прагу душы ў пошуках суладдзя і асэнсавання рэчаіснасці.

Errare humanum est, але, здаецца, у сакавіку бягучага года мы сталі сведкамі зараджэння новай, іншай Беларусі. Нешта зрушылася ў грамадскай свядомасці, скаланулася ў глыбінных нетрах пасля дзесяцігадовай летаргіі. Нягледзячы на масавыя запалохванні (ад звальнення з працы да тэрарыстычных актаў), распальванне псіхозу, многія людзі выйшлі і прыехалі на цэнтральныя плошчы сталіцы. Яны стаміліся ад дзяржаўнай хлусні, ад таго, што з іхнымі галасамі ніхто не лічыцца, стаміліся ад свайго канфармізму і маўчання. Далейшыя падзеі прывялі да таго, што тысячам новых грамадзян краіны стала зразумела, што ўлада трымаецца пераважна на брутальнай сіле і замбаванні той няшчаснай часткі насельніцтва, якая ніколі за ўсё жыццё не мела праўдзівай інфармацыі. Найбольшая праблема — гэта грамадзянскі раскол у Беларусі. Ён досыць глыбокі, спатрэбіцца нямала часу, каб пераадолець гэтую нянавісць і фобіі рознага кшталту.

Хіба ніколі ў гісторыі Беларусі такая колькасць вернікаў не малілася за сваю краіну, за свабоду. Беларусы ў сакавіцкіх падзеях выявілі сябе як люд хрысціянскі, люд цывілізаваны. Сотні людзей былі кінуты за краты, некаторыя дагэтуль сядзяць пад адміністрацыйным арыштам ці следствам па высмактаных з пальца крымінальных справах. Але „зварушаны нарэшце дух народны”. Асабліва ўразіў моладзевы рух, які можна называць масавым. Юнакі і дзяўчаты, нават падлеткі, далі яскравы прыклад актыўнасці старэйшаму пакаленню. Кожны дзень спантанна ў краіне адбываюцца новыя мірныя акцыі. Міліцыя і іншыя „органы” шалеюць і ўпершыню за апошнія дзесяць гадоў пачынаюць баяцца. Людзі ў Мінску запальваюць і ставяць свечкі, прыносяць кветкі ў розныя мясціны. А галоўнае, у адрозненне ад безнадзейнага 2001 года, „жыццё чуваць з усіх старон”.

Небывалую цікавасць і розгалас беларускія падзеі выклікалі ў свеце. Падтрымку нацыянальна-вызвольным сілам, вязням сумлення выказалі шматлікія палітычныя дзеячы, сусветныя маральныя аўтарытэты, тысячы звычайных людзей з розных краін. Упершыню на афіцыйным роўні прэзідэнт ЗША Джордж Буш павіншаваў беларускі народ з 88-мі ўгодкамі абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі. Галоўны від падтрымкі, якой чакаюць беларусы ад цывілізаванага свету — гэта ўсемагчымы ціск на маскоўскі Крэмль, які сфармаваў і ўтрымвае дыктатуру ў Беларусі.

Сфальшаваныя вынікі выбараў прызнала толькі купка краін, якім да дэмакратыі далёка як ваўкам да вегетарыянства. Самай першай, канешне, пуцінская Расія, пасля кастраўская Куба, аліеўскі Азербайджан, Іран, Кітай (паказальна, што адразу пасля афіцыйнага візіту ў Паднябесную Пуціна), яшчэ нейкі палкоўнік ці генерал з Бермудаў. У сітуацыі агульнасусветнага непрызнання ўжо ніяк не даводзіцца гаварыць пра чарговую „элегантную” перамогу над сваім народам. Ды і няма каму гаварыць. Аляксандр Лукашэнка прапаў з тэлеэкрана, яго няма на людзях ужо два тыдні, краіна поўніцца самымі неверагоднымі чуткамі. Такога за дванаццаць гадоў яго царавання таксама не было. Першага красавіка, у дзень гумару, самым папулярным чорным жартам быў той, што Аляксандр Лукашэнка падаў у адстаўку з пасады прэзідэнта. Жарты жартамі, але не з'явіўся ён і 2 красавіка — у дзень дзесятых угодкаў стварэння так званай расійска-беларускай садружнасці (справа ўсяго жыцця Лукашэнкі!).

Больш усяго не хочацца даваць нейкія катэгарычныя ацэны лідэрам айчыннай апазіцыі, штабам кандыдатаў у прэзідэнты, палітычным партыям. На гэта яшчэ не прыйшоў час. Кожны працаваў, відаць, так, як лічыў патрэбным і кіраваўся сваімі меркаваннямі. Папросту, у такой складанай сітуацыі вельмі цяжка вынайсці легальныя і легітымныя механізмы змены ўлады. А пакуль, на маю думку, усім, хто залічае сябе да апазіцыі, трэба абвесціць мараторый на рэзкія публічныя меркаванні і высновы ў дачыненні да асоб і рухаў, якія выяўляюць супраціў рэжыму.

А галоўнае не згубіць „агонь гарачы веры, — Хай не відаць яго (...) а ўсё ж ткі ён не згас!”

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Вачыма еўрапейца

Рэстрыкцыі!

Беларусы, якія ляварот Польшчы мараць аб тым, каб стаць часткай дэмакратычнага свету на ўскраіне Еўропы, не заслугоўваюць на тое, каб абяцаная ў гэтыя дні заходнімі дзяржавамі падтрымка абмежавалася да пустых слоў, — прачытаў я ў апошні час у адной з вядучых іспанскіх газет El Pais. Гэты каментарый, як і шмат іншых апублікаваных у заходняй прэсе ў падобным тоне, сутыкнуўся з рашэннямі краін Еўрасаюза, сярод іх і Польшчы, ды ўрада ЗША аб увядзенні рэстрыкцый у адносінах да Беларусі за сфальшаванне прэзідэнцкіх выбараў і рэпрэсаванне апазіцыі. Галоўным чынам справа заключаецца ва ўвядзенні візавых санкцый у адносінах да асоб, якія за гэтым стаяць. Польскае Міністэрства замежных спраў прадбачыла падтрымку на еўрасаюзным форуме „ідэі замарожання грашовага актыву асоб адказных за парушэнні асноўных грамадзянскіх свабод” у Беларусі. Гэтае ведамства паінфармавала таксама, што „ўсчаты энергічныя дзеянні дзеля абароны інтарэсаў польскіх грамадзян прабываючых у Беларусі”. Было заяўлена: „Адначасова трэба падкрэсліць, што Польшча мае намер застацца краінай адкрытай на кантакты з беларускім грамадствам”. Тры дні ад выдачы гэтай заявы прэм'ер Казімеж Марцінкевіч і лідэр беларускай апазіцыі Аляксандр Мілінкевіч ды рэктары польскіх вышэйшых навуковых устаноў падпісалі інтэнцыйны ліст, згодна з якім у вышэйшых школах Польшчы зможа пачаць навучанне каля 300 студэнтаў з Беларусі, выкінутых са школ за „падрыўную” дзейнасць.

Тым часам прэстыжны часопіс New York Times на сваёй інтэрнэтавай бачыне апублікаваў папярэдні спіс беларусаў, якія маюць быць у найбліжэйшым часе ахоплены міжнароднымі санкцыямі. Гэта якраз яны галоўным чынам будуць мець замарожаны актыў, укладзены на тэрыторыі ЕС ды ахопіць іх забарона ўезду ў еўрасаюзныя краіны. Пакуль у спіс занесены 47 асоб. Адкрывае яго, вядома, Аляксандр Лукашэнка. За ім апынуліся тут м.інш. міністр адукацыі Аляксандр Радзькоў за выкідванне студэнтаў з вучэльняў, міністр інфармацыі Уладзімір Русакевіч за закрыванне незалежнай прэсы, міністр юстыцыі Віктар Галаванаў за „тое, што ўчыніў з судовай сітэмы прыладу рэжыму”. Сярод „невыязных” бачым прозвішчы блізкіх супрацоўнікаў Аляксандра Лукашэнкі, афіцэраў бяспекі з іх шэфам Сцяпанам Сухаранкам, суддзёў, пракураў, кіраўнікоў цэнтральнага і абласных выбарчых камітэтаў, журналістаў і шэфаў дзяржаўных СМІ, сярод іх кіраўнікоў „Советской Белоруссии”, шэфаў праграм тэлебачання БТ, ОНТ, СТВ і РЭН. Сярод журналістаў апынуліся тут такія зоркі рэжымнай прапаганды як Аляксандр Аверкаў, Юры Гроераў, Лізавета Казакова, Юры Азаронак ці Яўген Новікаў. Вялікімі літарамі ўказваюцца правіны мінскай суддзі Надзеі Равуцкай, якая 15 суткамі арышту пакарала м.інш. лідэра Беларускага народнага фронту Вінцука Вячорку. Падобна патрактавалі пракурора Мікалая Купрыянава. У спіску няма лідэраў пралукашэнкаўскага Саюза палякаў Беларусі, якія пасрэдна спрычыніліся да расправы над СПБ Анжалікі Борыс і давялі да праследу яго лідэраў і сяброў. Спіс — як заявіла Польскае прэсавае агенцтва — падрыхтавалі паслы краін ЕС у Мінску. Канчаткова мае быць ён прыняты пасля кансультацый са ЗША 10 красавіка ў час сустрэчы міністраў замежных спраў Еўрасаюза ў Люксембургу.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Урэшце ўлада запанікавала. Людзей сталі праследаваць, палохаць, заводзіць крымінальныя і адміністрацыйныя справы, выганяць з працы...

Пасля выбараў патрабуем выбараў!

Цэнтральная выбарчая камісія па выбарах прэзідэнта Рэспублікі Беларусь падвяла вынікі ўсёй выбарчай кампаніі 2006 года. Выбары адбыліся, выбары скончыліся. Прэзідэнтам лічаць Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнку. У гэты час працягваюцца акцыі нязгодных з такім рашэннем, сядзяць у астрогах сотні людзей, якія пратэставалі супраць фальсіфікацыі выбараў, працягваюцца крымінальныя справы, заведзеныя на актывістаў апазіцыі, Еўропа і ЗША абураныя паводзінамі беларускіх уладаў, новы стары прэзідэнт не паказваецца на людзях, Расія збіраецца павялічыць кошты на свой, будзь ён тройчы пракляты, газ аж у пяць разоў, а інаўгурацыя кіраўніка дзяржавы, без усялякіх тлумачэнняў пра прычыны, адкладзена на нявызначаны тэрмін. Па некаторых звестках Лукашэнка збіраецца ехаць у Маскву да Пуціна. Вельмі сімвалічна, што прэзідэнцкая кампанія заканчваецца тым, з чаго пачыналася — Аляксандр Рыгоравіч наведвае Крэмль, дзе вядзе перамовы пра кошты на газ, „Белтрансгаз" і ўласны лёс. Пуціна нічый лёс не цікавіць. Толькі кошты на газ, „Белтрансгаз" і беларуская зямля. Маскоўскім кіраўнікам, якія кантралююць шостую частку сушы планеты, заўсёды мала зямлі.

На пачатку выбарчай кампаніі беларускі кіраўнік прыляцеў з Масквы з усмешкай на твары — газ для нас будзе танней, чым для непаслухмянай Крамлю Украіны. Усмешка сведчыла і яшчэ пра адно — Расія зноў зрабіла стаўку на Лукашэнку. Апазіцыя ў гэты час, пад насмешкі афіцыйных дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі і пры сцвярджэннях кіраўніка дзяржавы, што нават у аб'яднанай апазіцыі будзе сама меней пяць адзіных кандыдатаў на прэзідэнцкае крэсла, рыхтавалася да выбараў. Галоўная задача, якую яна паставіла перад сабой — абраць адзінага прадстаўніка ад апазіцыі на кандыдата ў прэзідэнты Рэспублікі Беларусь. Для гэтага быў створаны пэўны механізм. Аб'яднаныя ў „Дзесятку плюс" большасць дэмакратычных структур пачалі праз правядзенне рэгіянальных сходаў вызначацца з кандыдатамі на Кангрэс дэмакратычных сіл, дзе і мусіў вызначыцца адзіны. На гэтую пасаду прэтэндавалі Аляксандр Мілінкевіч, беспартыйны з Гродна, кандыдатуру якога вылучыла маленькая партыя зялёных і падтрымала самая вялікая апазіцыйная партыя Беларусі БНФ, Анатоль Лябедзька — кіраўнік Аб'яднанай грамадзянскай партыі, Сяргей Калякін — лідэр Партыі камуністаў Беларусі і Станіслаў Шушкевіч — былы спікер Вярхоўнага Савета XII склікання, фактычна першы кіраўнік Рэспублікі Беларусь, старшыня партыі БСДГ. Іншыя кандыдатуры ўжо „адсекліся" на рэгіянальных сходах. Па-за структурамі „Дзесяткі плюс" самастойна выстартавалі ўсім вядомы Зянон Пазьняк — старшыня Кансерватыўна-хрысціянскай партыі БНФ, і амаль нікому тады яшчэ невядомы Аляксандр Казулін, які зусім нядаўна прыйшоў на палітычнае поле Беларусі і адразу ўзначаліў БСДПГ — адну з партый сацыял-дэмакратычнага кірунку. Самастойна паспрабавалі стартаваць і дэпутаты парламента папярэдняга склікання генерал Валеры Фралоў і Сяргей Скрабец, які знаходзіўся ў гэты час у турме.



Выхад на свабоду пасля зняволення за пратэст на Кастрычніцкай плошчы ў Мінску

www.charter-97.org

На Кангрэсе перамог Аляксандр Мілінкевіч. Станіслаў Шушкевіч зняў сваю кандыдатуру. Галоўны канкурэнт Мілінкевіча Анатоль Лябедзька, якога ў другім туры галасавання падтрымала і большасць прадстаўнікоў Сяргея Калякіна, адстаў усяго на восем галасоў. Улады паціралі рукі, прадбачваючы раскол і гэтай апазіцыйнай структуры. Але дэмакраты тым і адрозніваюцца ад дыктатараў, што для іх ідэалагічныя спрэчкі і канкурэнтная барацьба — справы цалкам натуральныя. Гэтак жа як і аб'яднанне рознага кірунку структур дзеля дасягнення галоўнай мэты. На гэты раз, галоўная мэта — скінуць таталітарны рэжым была настолькі важнай, што і пасля кангрэса партыі „Дзесяткі плюс" і надалей працягвалі працаваць разам. Падпісаныя раней дамоўленасці былі выкананы.

Улады адказалі ўзмацненнем рэпрэсій супраць апазіцыянераў. Яшчэ пры правядзенні рэгіянальных сходаў людзі сутыкнуліся з праследам, татальнай адсочкай і праблемамі на працы і месцы вучобы. Зараз націск уладаў патроіўся. Але самай эфектыўнай палкай у колы стала абвяшчэнне выбараў на чатыры месяцы раней меркаванага. Яны яшчэ прыпадалі на самы востры перыяд выбараў на Украіне, куды і скіроўвалася асноўная ўвага міжнароднай супольнасці. Самы востры перыяд, калі трэба было збіраць подпісы, прыпадаў на навагоднія і калядныя святы. Стала зразумелым, што ўвесці ў шок беларускую наменклатуру і Расію (куды нервуючы многіх актывістаў апазіцыі сталі наведвацца іх лідэры) і сабраць каля мільёна подпісаў — не ўдасца. Але сумненняў у тым, што ўдасца сабраць больш неабходнай колькасці — не было. Так і сталася. Пасля таго як Зянон Пазьняк заявіў, што яго ініцыятыўная група здаваць подпісаў не будзе, а Валеры Фралоў і Сяргей Скрабец не набралі патрэбнай колькасці, на галоўную пасаду краіны засталося чатыры прэтэндэнты. Аляксандр Мілінкевіч, Аляксандр Казулін, Аляксандр Лукашэнка і Сяргей Гайдукевіч, на якога ніхто сур'ёзна не ўзіраўся з перакананання, што гэты чалавек пастаўлены Лукашэнкам і для Лукашэнкі. Застаўшыяся ў гульні лідэры ад апазіцыі ўсё часцей пачынаюць заклікаць людзей выйсці ў дзень выбараў на плошчу. Зянон Пазьняк прапаноўвае свой варыянт „народнага галасавання" і таксама заклікае на плошчу.

З экранаў беларускіх тэлевізараў паліліся тоны прапагандысцкага бруду на апанентаў дзеючаму прэзідэнту. Цікавы той факт, што прапаганда ў асноўным зводзілася да чорнага піяру. Уладам не было чым пахваліцца. Не было за што хваліць свайго кіраўніка. Таксама ў іх не было ідэалогіі, якая б магла згуртаваць масы. Таму бруд ліўся на Еўрасаюз, куды беларускі народ нібыта сілай цягнуць кандыдаты ад апазіцыі, на ЗША, як на нібыта краіну-монстра, якая хоча адна кіраваць усім светам, а асабліва беларусамі. Са станоўчага ўлады змаглі выставіць толькі даўні лозунг апазіцыі „За Беларусь". Таму пад лозунгамі „За Беларусь", ці калі паіранізаваць „Ніхто не супраць Беларусі" пайшлі і ўлады, і апазіцыя. Хіба гэта і ёсць галоўнае дасягненне навейшай беларускай гісторыі. Больш лозунгі пра інтэграцыю, пра славянскае братэрства, пра ўсходнеславянізм, пра аднаўленне Савецкага Саюза і пра „Мы ж без Расіі прападзём" — не спрацоўваюць. А пры такім ходзе падзей уладам разлічваць на справядлівы выйгрыш не даводзілася.

Урэшце ўлада запанікавала. Людзей сталі праследаваць, палохаць, заводзіць крымінальныя і адміністрацыйныя справы, выганяць з працы. У дзень выбараў значная частка актывістаў, якія маглі арганізаваць супраціў фальшаванню выбараў і вывесці людзей на вуліцу была арыштавана па розных надуманых прычынах і кінута за краты. Але іх агітацыйныя намаганні не прапалі марна. Людзі ўсё адно выйшлі. Выйшлі самі, стыхійна і самаарганізаваліся. Выйшлі, не зважаючы на запалохванні ўладаў мажлівасцю тэрактаў і крымінальнымі справамі. Выйшлі смела і рашуча. Ад рашучасці беларусаў на плошчах і вуліцах беларускай сталіцы, здаецца, разгубіліся не толькі ўлады, але і апазіцыя. Людзей арыштоўвалі, саджалі, але на іх месца прыходзілі іншыя. Нервы ўлады здалі. І хіба не толькі беларускай улады. Пуцін, у выхадны дзень, тэрмінова збірае савет бяспекі. Пасля гэтага сілавы разгон палатачнага гарадка, прымяненне спецсродкаў пры разгоне дэманстрантаў, газ (хіба і гэты расійскай вытворчасці), выбухі, арышты, збіванні, суды, прапаўшыя людзі, падазрэнні на забойствы...

А людзі ўсё адно прыходзяць. Ставяць свечкі ў знак салідарнасці з арыштаванымі, праводзяць акцыі пратэсту, патрабуюць праўды. Людзі перасталі баяцца. Людзі патрабуюць пераменаў, патрабуюць справядлівасці, патрабуюць выбараў.

Аляксандр Казулін за кратамі. На яго завялі некалькі крымінальных спраў. Аляксандр Мілінкевіч на плошчы заявіў, што не прызнае вынікаў выбараў і збіраецца змагацца да канца. Абвешчана стварэнне новага руху за свабоду. Выбарчыя штабы кандыдатаў у прэзідэнты ад апазіцыі не расходзяцца, толькі працягваюць працаваць далей. Людзі падтрымваюць палітвязняў і надалей выходзяць пратэставаць на вуліцу. Стыхійна ўзнікла нябачная дагэтуль салідарнасць. Людзі перамаглі свой страх. Выступленні прадстаўнікоў улады і нават сілавых структураў нервовыя і блытаныя. Міжнародная супольнасць абураная дзеяннямі ўлад, патрабуе спынення рэпрэсій, пагражае санкцыямі. Лукашэнку павіншавалі з перамогай толькі Пуцін і яшчэ некалькі кіраўнікоў недэмакратычных краінаў. Нават калегі па СНД адмоўчваюцца. Усё часцей гучаць папрокі ў бок Масквы за падтрымку дыктатуры на Беларусі. Папрокі як з боку беларускай апазіцыі, так і з боку міжнародных структур. Нават у самой Расіі стыхійна паўстаюць рухі, якія асуджаюць палітыку Крамля ў дачыненні да Беларусі. У Крамлі таксама пачынаюць разумець, што карабель Лукашэнкі, танучы, можа зацягнуць у той вір шмат крамлёўскіх „властьимущих".

А на Беларусі чакаюць перамен, новых выбараў, падзення сённяшняга рэжыму. І працягваюць за гэта змагацца. Амаль усе ўпэўненыя: падзенне гэтага рэжыму — справа хуткага часу.

Генрых Рэзнік

Людзі „Нівы”

Вера Папова

Працавала я чатыры гады ў друкарні, набірала „Газету беластоцкую”. У 1956 годзе, калі мела выходзіць „Ніва”, паклікаў мяне да сябе дырэктар Беластоцкага паліграфічнага прадпрыемства Раман Бараноўскі і спытаў ці я ведаю беларускую мову; ён, відаць, даведаўся, што ў савецкі час я вывучала гэтую мову ў Зачарлянах. Я адказала, што крыху ведаю. Ён прынёс мне нейкі беларускі тэкст, я яго памалу прачытала і ён заключыў, што я спраўлюся з новай задачай.

Працы з „Нівай” было шмат. З рэдакцыі дастаўлялі мне машынапісы, а я набірала гэтыя тэксты на лінатыпе. Бывала, што працавала да раніцы. Калі ўзнікалі ў мяне нейкія сумненні, я хадзіла або тэлефанавала ў рэдакцыю; з рэдакцыяй мне вельмі добра супрацоўнічалася. Працы з „Нівай” прысвяціла я трыццаць шэсць гадоў. Пасля майго адыходу на пенсію на лінатыпах коратка набіраў „Ніву” Янка Хлябіч, а неўзабаве прыйшла новая тэхніка — камп’ютэры.

Валянціна Жэшка

На працу ў „Ніву” прыйшла я з 1 чэрвеня 1956 года. Раней і не падумала, што такое можа здарыцца. Жыла я ў Бельску, там паўстаў мастацкі калектыў пад кіраўніцтвам Таццяны Гіжэўскай, я там была. Запрапанавалі мне калектыў у Беластоку і сказалі, што будзе праца ў „Ніве”. Адразу скіравалі мяне працаваць карэктарам. Карэктурай займалася яшчэ Ліда Калішэвіч і тэхнічны рэдактар, мужчына. Яны пасля паадыходзілі і я асталася адна, сама ў друкарні ўсяго дапільноўвала. Працы было многа, бывала, што хапала аж да раніцы. Супрацоўнікі былі вельмі добрыя і час прыемна і хутка мінаў. **(ав)**

Шануюць мову

Маю на думцы нядзельныя тэлеперадачы для літоўцаў, пражываючых у наваколлі Пуньска на Сувальшчыне. Літоўцаў у Польшчы нямнога, бадай каля дзесяці тысяч, але якія яны дружныя, як шануюць сваю родную літоўскую мову; гэта не ў нас! Яны ў мікрафон перад тэлекамерай, пачынаючы ад простага чалавека да прафесара і святара, усе гавораць на сваёй роднай мове. Яны маладцы, вартыя пашаны.

А як у нас або ў украінцаў маецца гэтая справа? Нас жа намнога больш за літоўцаў... Лічыць, што ў нас жаласна, дамінуе ў нашых перадачах польская мова і рэдка нейкі вучаны беларус гаворыць па-беларуску, толькі пакорліва „цокае”. Гэтак жа і вечарам, калі ідзе праваслаўная перадача. Хаця гэта не мая справа кагосьці павучаць, бо ў кожнага свой розум, аднак памойму варта было б, каб нашы бацюшкі заміж па-польску сталі гаварыць па-беларуску, бо кожнаму з іх, вучаных, лёгка з гэтым справіцца. Я, чалавек просты, мо і не маю чым пахваліцца, але з бядою магу нешта па-беларуску сказаць.

Мікалай ПАНФІЛЮК

Гаспадар і грамадскі дзеяч

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Размова з Янам ДРАЎНОЎСКІМ, радным Нараўчанскай гміны (выбраным ад Беларуска-народнага выбарчага камітэта) і ўзорным гаспадаром.

— У Нараўчанскай гміне ў апошнім скліканні праводзілася многа інвестыцый.

— Водаправодная сетка ахоплівае ўжо ўсе вёскі нашай гміны і ў большасці населеных пунктаў пракладзеная каналізацыя. Працуюць у нас тры ачышчальні сцёкаў, да якіх будзем падключаць каналізацыйную сетку з чарговых вуліц Нараўкі і навакольных вёсак. У гэтым годзе, між іншым, прадугледжваецца падключаць да каналізацыйнай сеткі Міклашэва. Выступаем мы зараз за еўрасаюзнымі сродкамі на інвестыцыі, якія папаўняем сродкамі гміннага бюджэту.

— А як са звалкай смецця?

— Звалка смецця ў нас будавалася таксама пры падтрымцы еўрасаюзных сродкаў. Яна згодная з еўрасаюзнымі патрабаваннямі. Забяспечана знізу, каб нечыстоты не пранікалі ў зямлю. Беспрацоўныя нашай гміны, за аплатай, сартуюць адкіды і выбіраюць з іх шкло, метал і паперу. Смецце, якое не падыходзіць да паўторнага выкарыстання, паліваецца вадой і прысыпваецца, каб не шкодзіла асяроддзю.

— Жыхары вёсак часта настойваюць, каб у першую чаргу будаваць дарогі.

— Апошнім часам мадэрнізаваліся дарогі з Нараўкі ў Янова і з Плянты ў Лясную. Распачалася перабудова дарогі Лясная — Семяноўка, якая будзе працягвацца. Мадэрнізаваліся таксама даязныя дарогі на палі. У 2005 годзе праводзіліся рамонты Гміннага асяродка культуры і Асяродка спорту і адпачынку ў Нараўцы. Рамантаваліся клубы ў Міклашэве і іншых вёсках.

— У Нараўчанскай гміне больш прадпрыемстваў, чым у суседніх гмінах. Яны папаўняюць бюджэт гміны, абмяжоўваюць беспрацоўе...

— У мінулым не было ў нас беспрацоўя. Толькі пры перавалцы грузаў на граніцы з Беларуссю занятых было каля 800 асоб. Хаця апошнім часам паяўляліся новыя месцы працы, то многа маладых людзей надалей не можа знайсці работу. Найцяжэй знайсці працу асобам з вышэйшай адукацыяй. У школе і гміннай установе ёсць ужо працаўнікі. Хаця лягчэй знайсці работу рабочым, то сярод людзей з прафесійнай адукацыяй таксама ёсць беспрацоўныя.

— У якіх прадпрыемствах працуюць работнікі зараз?

— Надалей вядзецца перавалка грузаў на чыгунцы, але апошнім часам прымаліся туды таксама асобы з-па-за нашай гміны. Крыху асоб працуе ў прадпрыемстве па перагрузцы і размеркаванню цэменту з-за ўсходняй мяжы. Працуюць у нас пякарня і дрэваапрацоўчыя прадпрыемствы. У Нараўчанскай гміне дзейнічае пад дваццаць прадпрыемстваў.

— Апошнім часам паявіліся фінансавыя складанасці ў керамічным прадпрыемстве ў Ляўкове.

— Калі на рынак сталі ўваходзіць новыя танныя будаўнічыя матэрыялы, паменшаў попыт на ляўкоўскую цэглу. Калі б яны прадалі ўсе запасы прадукцыі, пагасілі б даўгі.

— Вялікі ўчастак ля Комплексу школ у Нараўцы купіла прадпрыемства „Пронар” з Нарвы.

— Кіраўнік „Пронару” Сяргей Мартынюк абяцаў нам, што ў бліжэйшы час на месцы былой сельскагаспадарчай суполкі ў Нараўцы адкрые філіял свайго прадпрыемства. Зямлю паміж Нараўкай і Міклашэвам купіў ён ужо даўнавата, але многа часу заняло яму афармленне ўсялякіх дазволаў. Прадбачваецца, што ў новым прадпрыемстве будзе працаваць 170 асоб, і зараз у Нарве на заводзе „Пронар” працуе многа людзей з нашай гміны.

— У Нараўчанскай гміне многа лясоў. Гэта козыр для агратурызму.

— Агратурыстычныя кватэры знаходзяцца ў Нараўцы, Масеве і Ляўкове. У Масеве і Альхоўцы купляюць дамы жыхары з глыбіні Польшчы. Адчынена таксама агратурыстычная кватэра ў Міклашэве, але ў нашай вёсцы няма зацікаўлення купляй дамоў.

— Жыццё побач лесу дае не толькі козыры, але і адмоўнае ўздзеянне на сельскагаспадарчую вытворчасць.

— Бабры выходзяць з лесу і завальваюць меліярацыйныя равы, зубры нішчаць дрэвы. Праязджаючы лесам мусім пільна сачыць за дарогай, бо прабягае праз яе ўсялякая звярына. Калі адна каза перабяжыць дарогу, то трэба тармазіць, бо другая ўжо не разглядаецца, а бяжыць за першай. Апошнім часам у лесе паявілася многа ваўкоў. Здараецца, што гоняць яны аленяў ажно пад гаспадарчыя будынкі.

— Вы зараз гаспадарыце ў Міклашэве разам з жонкай Зояй, але раней працавалі па-за сваёй гаспадаркай.

— Я 6 гадоў перапрацаваў у сельскагаспадарчай суполцы ў Міклашэве, 15 гадоў працаваў у Белавежскім асяродку лясного транспарту, а пасля заняўся толькі гаспадаркай.

— Якая была ў Вас гаспадарка?

— Было ў нас 15 гектараў зямлі. Гадавалі мы адначасна па 6 кароў і 10 бычкоў. У 1988 годзе заняў я трэцяе месца ў Беластоцкім ваяводстве па вытворчасці ялавічыны і атрымаў дыплом ад ваяводы.

— Рэнтабельнасць сельскагаспадарчай прадукцыі была тады вялікай.

— За грошы ад продажу мяса мы купілі новы трактар, а пасля прыдбалі другі. З сельскай гаспадаркі мы купілі аўтамашыну „Фіят-125”, збудавалі хату і ўсе гаспадарчыя будынкі. Прыбытак мелі таксама ад продажу авечай воўны і шкураў. Шылі тады кажухі і рабілі світэры з воўны.

— Зараз Вы таксама гаспадарыце?

— Няма ўжо з нас добрых гаспадароў. У мяне два разы быў інфаркт, нельга мне цяжка працаваць і таму мы выдатна абмежавалі сваю прадукцыю. Гадуем яшчэ 5 коней, 2 каровы і некалькі цялят. Трымаем таксама 10 свіней, якіх выводзім са сваіх парасят. З мінулага года мы сталі пераходзіць на экалагічнае гаспадаранне. Збожжа і бульбу будзем выкарыстоўваць для сваіх патрэб і на корм для жывёлы.

— Вы таксама займаецеся грамадскімі справамі.

— Грамадска я раблю ў Воднай суполцы ў Нараўцы і належу да Прыхадской рады пры царкве ў Нараўцы. Зрабілі мы рамонт прыхадскога дома і добраўпарадкавалі могілкі. Нядаўна для Нараўчанскай парафіі вярнулі 18 гектараў зямлі. Частку яе хочам прадаць і за выручаныя сродкі распачаць рамонт царквы. Прыход у нас вялікі, бо належыць да яго ажно 18 вёсак. Праўда, у некаторых з іх вельмі мала жыхароў і маладыя, жэнячыся з каталікамі, пераходзяць на іх канфесію. Раней у Міклашэве жылі толькі праваслаўныя, а зараз траціну вяскоўцаў складаюць каталікі.

— Дзякую за размову.

Гутарыў Аляксей МАРОЗ

Было 7 пастухоў у Сукавічах

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

У Сукавічы іду разведаць пра людзей, што калісь валілі валёнкі. Раніца марозная і сонечная, якая прадвяшчае адлігу ў дзень. Вуліца ў Сукавічах пустая, не відаць ні душы, нават на панадворках. На некаторых панадворках няма людскіх слядоў. Заходжу на канец вёскі і кіруюся назад. Насупраць апошняй хаты быццам чую нейкі адгалосак. Заходжу перад хату, на парозе выглядае пажылая жанчына, кіруе мяне ў хату насупраць.

Заходжу ў хату, дзе пражывае пара пажылых гаспадароў, абое па восемдзесятцы. Яны спачатку дапытваюцца пра мяне, нам удаецца такім чынам устанавіць нават супольных знаёмых у незнаёмай мне дагэтуль вёсцы. А калі ўжо ўстаноўлены такія арыенціры, тады і размова атрымлівае своеасаблівую падмазку.

Мае суразмоўцы калісь сапраўды качалі валёнкі. Рабілі гэта аднавяскоўцам і жыхарам суседніх вёсак з даручанага матэрыялу. А матэрыял той не мог быць абы-які. Воўна павінна была быць вычасана, асенняя; воўна стрыжаная навесну не была прыгодная для валення, не мела таго клею, якім склейваліся валасінкі. Слоем такой воўны абвівалі папяровыя выкрайкі, дзве пары, каб тая воўна трымалася абвязвалі іх ніткай, мачылі ў гарачай вадзе і качалі. Калі ўжо воўна крыху збівалася, вымалі выкрайкі і ўсярэдзіну клалі капылы і правідлы ды далей качалі пакуль воўна не збівалася ў абутак.

Мае суразмоўцы сталі займацца валеннем валёнак, калі ім было недзе пад трыццаць. Выраблялі, бывала, нават па сто дваццаць пар у сезон. Работа была не з лёгкіх, трэба было часта працаваць і ноччу, калі найбольш спаць хочацца. Да таго ж, хаця воўну мачылі, у хаце заўсёды аставалася поўна валасінак воўны, яны ўсюды пранікалі, да ўсяго чапляліся. Тая воўна брыдла, брыдла, аж аднойчы мае суразмоўцы ўкінулі ў печ некалькі мяшкоў капылоў і правідлаў. І так гэты бізнес закончыўся.

У Сукавічах вырабам валёнак з сукна займалася некалькі чалавек. А валёнкі з сукна шыў майстар у Шудзялаве, вельмі добры шавец. Каб атрымаць сукно, трэба было ваўняную тканіну вазіць у фалюш. Мой суразмоўца меў сваякоў у Маеве, што за Саколкай. Ехаў да іх начаваць і адтуль падаваўся ў фалюш, што ў Сухаволі быў. Фалюшнік браў тканіну, але не дазваляў падглядаць тайнаў сваёй працы, відаць баяўся, каб хто не падгледзеў тайнаў ягонай вытворчасці.

Аднойчы ехалі яны ў Сухаволю ў кампаніі іншых, незнаёмых, гаварылі па-польску. Адзін са спадарожнікаў кажа ўголас:

— Ніколі я яшчэ не бачыў рускага чалавека; цікава, як такі выглядае.

А той сваяк кажа:

— Я рускі.

І таму цікаваму стала канфузна; нават нічога не вымавіў у адказ.

Гутарка закранае і зіму, якая сёлета працягваецца. А калісь, у 1940 годзе, задула снегам так, што трэба было капаць тунелі. У той час саветы праводзілі вайсковыя манеўры. Салдаты капаліся ў снезе са станковымі кулямётамі. Зайшла група і ў хату маіх размоўцаў. Гападыня прапануе ім крыху з'есці цёплага, каб пагрэліся, а яны адказваюць, што ім нельга, бо афіцэр забараніў. То гаспадары спыталі ў афіцэра, ці могуць пачаставаць; той згадзіўся. У групе быў салдат з іншае часці і яго тыя адстаранілі. Але на пытанне, ці ён ужо не чалавек, не сумелі адказаць і той таксама сагрэўся.

Снегу тады было столькі, што засыпаў нават садовыя дрэвы, толькі вяршкі тырчэлі навонкі. І тыя вяршкі пааб'ядалі зайцы, якіх тады звалілася процьма; невядома, адкуль яны і браліся. Яны так пакалечылі яблыні, што тыя ўжо не маглі акрыяць і паўсыхалі, не ўдалося іх выратаваць.

У хату заглядае суседка, якая мяне сюды напраўляла. Прыйшла пабачыць, пераканацца, ці я не хаджу з нейкімі злымі мэтамі. Пасядзеўшы і скінуўшы з плеч устрывожанасць, вяртаецца назад. У яе чацвёра дзяцей, усе ў Беластоку, усе добра ўладкаваны. І пастаянна запрашаюць яе, каб кідала адзінокае жыццё ў сваёй хаце і перабіралася да іх у горад. А яна не хоча ці то пакідаць сваёй хаты, дзе яна самастойнай гаспадыняй, ці то сваёй асобай не ўводзіць змен у зладжанае жыццё сваіх дзяцей. І тыя ўсе чатыры сям'і ейных нашчадкаў кожную суботу ці нядзелю наведваюць і даглядаюць бабульку.

І ў маіх гаспадароў трое дзяцей, таксама ўсе ўладкаваныя ў Беластоку. І так у цэлай вёсцы, дзе асталося 53 хаты. У Сукавічах пражывае цяпер усяго сорак дзве душы, з гэтага ліку толькі некалькі мужчын. А найчасцей у хатах асталіся толькі адзінокія жанчыны. У дзвюх хатах школьныя дзеці.

У Сукавічах толькі адзін гаспадар мае ўмяшчальнік на малако. Гаспадарку абрабляе яшчэ некалькі чалавек, але гэта гаспадаркі нетаварныя, трымаюцца яны на пенсіянерах. Некалькі гаспадароў трымала па крысе кароў і малако ад іх вазілі ў Шудзялава. З новага года пункт прыёму малака ў Шудзялаве закрыты і цяпер гэтую сыравіну трэба вазіць або ў Астравок, або ў Кнышэвічы. Зімою ў тыя вёскі можна праехаць толькі праз Шудзялава і пастаўка малака становіцца зусім нерэнтабельнай.

А калісь у Сукавічах было сем пастухоў: двух пасвіла кароў, двух авечак, двух свіней і адзін коней. І студня на ўсю ўсходнюю частку вёскі была адна. Па ваду трэба было ўставаць у чаргу апоўначы, бо ўжо да сёмай гадзіны раніцы ўсю вычэрпвалі. Людзі баяліся капаць, бо не мелі ўпэўненасці, ці дакапаюцца да вады, бо яна была глыбока. І па цэмент трэба было аж у Рось ездзіць жалезнымі вазамі. І часу займацца студняй з-за працы ў полі было мала. Толькі пры „дэмакратыі" сталі капаць больш калодзежаў.

І мае суразмоўцы былі выкапалі калодзеж. А то ж бывала зімою так задувала снегам, што пракапаюць праход для кароў да вясковае студні і пакуль тыя каровы нап'юцца, то ўжо той праход зноў снегам зацягне. А нядаўна мае суразмоўцы працягнулі ваду ў хату. Працу выканала фірма з Беластока, хлопцы, што рабілі, былі дзесь ад Бельска. І вельмі добра ўсё зрабілі, сумленна. Цяпер з хаты трэба выходзіць толькі каб дроў прынесці, а ўся рэшта — на месцы. А пра падарожжы ў Рось, Сухаволю ці, на канец, у Беласток, дзе ставілі дом дзецям, можна паўспамінаць каля цёплай печы даўняй канструкцыі.

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Пратэст пад консульствам

У пятніцу 24 сакавіка пад Генконсульствам РБ у Беластоку на 15.00 гадзіну сабралася каля 60 студэнтаў і невялікая група іншых дэманстрантаў з вялікім бел-чырвона-белым сцягам ды лагатыпам Грамадзянскай платформы. Маніфестацыю сарганізавала Вышэйшая школа публічнай адміністрацыі, пры падтрымцы юрыдычнага факультэта Універсітэта ў Беластоку, былі таксама студэнты філалагічных аддзяленняў. Моладзь з беларускімі і адмысловымі блакітна-джынсавымі сцяжкамі выгуквалі воклічы „Лукашэнка — узурпатар" ды „Mińsk — Warszawa: wspólna sprawa", „Ręce precz od Białorusi — Łukaszenka odejść musi!", „Łukaszenko — z tobą cienko!" ды старалася ўручыць ліст генеральнаму консулу Рэспублікі Беларусь. У гэтым пасланні (якое канчаткова было пакінутае ў скрынцы на браме консульства) сцвярджаецца: „Сённяшняй ноччу ў жорсткі спосаб было прыменена насілле ў адносінах да ўдзельнікаў мірнай дэманстрацыі супраць сфальшавання прэзідэнцкіх выбараў на Беларусі. Каля 3 гадзіны ночы на Кастрычніцкую плошчу ўвайшлі атрады міліцыі і арыштавалі 300 дэманстрантаў. Перавезлі іх у арышт на Акрэсціна. Міліцыя ў грузавіках біла арыштаваных (...). Сярод затрыманых ёсць таксама грамадзяне Польшчы. (...) Гэтая жорсткая акцыя ў чарговы раз ставіць перад светам праблему парушання правоў чалавека і грамадзяніна беларускімі ўладамі. Патрабуе рашучай рэакцыі. Таму асуджаем дзеянні прэзідэнта Лукашэнкі. Патрабуем пачаць рашучыя дзеянні дзеля ўшанавання правоў чалавека ў Беларусі. Дэмакратычны свет не забудзе аб тых, хто парушае правы ўласнага народа. Запэўніваем, што мы, палякі, не пакінем у адзіноце беларусаў рэпрэсаваных за змаганне за належныя ім правы. Прымаючы пад увагу заўвагі наглядальнікаў АБСЕ ды перадачы журналістаў аб спосабе правядзення сакавіцкіх прэзідэнцкіх выбараў у Рэспубліцы Беларусь, лічым іх сфальшаванымі. Заклікаем прэзідэнта Аляксандра Лукашэнку да новага правядзення выбараў у сумленны спосаб, запрашэння ўсіх кандыдатаў на роўных правах у СМІ, спынення рэпрэсій у адносінах да беларускай апазіцыі, вызвалення ўсіх арыштаваных і затрыманых па прычыне іх палітычных поглядаў. Дэкларуем салідарнасць з беларускім народам у яго барацьбе за свабоду і дэмакратыю. Жыве Беларусь! Wolna Białoruś!"

Мой сцяг ужо тры дні лунае над балконам мае бабулі Ядвігі над вуліцай Палацовай, — кажа студэнт Кшыштаф Гос, які паявіўся на дэманстрацыі з уласным вялікім бел-чырвона-белым сцягам. З ім прыйдзе і на Дзень волі. Паявіцца таксама там і пані Святлана Станкевіч, адна з тых, што адвольна прыйшлі пад консульства, са сваім беластоцкім сябрам, які дагэтуль не цікавіўся палітыкай, а тым больш Беларуссю. Проста: яны — за Беларусь. **(лук)**

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Лідзія Мартынюк: Ад нас прыехала дзевяць дэкламатараў. Гэта амаль палова ўсіх навучэнцаў...

Свята дзяцей

Да конкурсу „Роднае слова" рыхтуюцца ўжо амаль усе навучэнцы беларускай мовы ў Беластоку. Гэты конкурс дае магчымасць не толькі заблішчаць на сцэне, але і пазнаёміцца з беларускімі аўтарамі і іх творамі. Другі, не менш важны атракцыён конкурсу — сустрэча з дзяцьмі і моладдзю з іншых гарадоў і вёсак.

— Ад нас прыехала дзевяць дэкламатараў, — кажа Лідзія Мартынюк з Рыбалаў. Гэта амаль палова ўсіх навучэнцаў. У школе засталіся 24 вучні. Ад верасня ўсе дэкламатары пойдуць вучыцца ў Заблудаў, дзе няма беларускай мовы. Ці далей будуць прыязджаць на беларускія мерапрыемствы?

— А гэта добрая нагода сустрэцца, параўнаць сябе з іншымі, — кажа пані Лідзія, якая гадамі рыхтуе вясковых дзяцей да беларускіх конкурсаў. І зараз яе выхаванцы добра падрыхтаваліся. Юстына Давідзюк заваявала першае месца!

Першае месца ўзяў таксама Якуб Андрацкі з Саколкі. Кубу падрыхтавала мама, настаўніца беларускай мовы ў Бабіках. З Бабікаў прыехала аж 9 дэкламатараў. Іх выступленні вылучаліся моўнай дапрацаванасцю. Яны найпрыгажэй вымаўлялі словы і правільна ставілі націскі. Тут таксама праявіўся сямейны феномен — Юстына, Паўліна і Павел Варановічы, уся тройка, перайшла на цэнтральныя элімінацыі.

Прыехалі таксама амаль усе навучэнцы беларускай мовы з Залук, дзе адрадзілася беларуская мова. Дэкламатараў прывезлі бацькі на сваіх машынах. У прыстойнай грамадзе паказаліся і гарадоцкія гімназісткі са сваёй новай настаўніцай Альжбетай Колтак. Сярод дзяўчат былі блізнючкі — Моніка і Магда Завадскія. Гэта Гарадок узяў галоўную ўзнагароду конкурсу. Гран-пры заваявала Кася Кузьміч, дэкламатарка са шматгадовым стажам. Кася выступіла з „Прадмовай да дудкі беларускай" Францішка Багушэвіча і поўнасцю захапіла не толькі камісію, але і публіку.

Як заўсёды шматлюдна паказаўся Беласток. Хоць сярод лаўрэатаў пераважалі вядомыя з папярэдніх гадоў прозвішчы. На першым месцы хочацца назваць выступленне гімназісткі Наталлі Швед. Наталька дэкламавала патрыятычны верш Пімена Панчанкі „Развітанне". Верш пра здзек над беларушчынай давёў самую выканаўцу да плачу!

Міхась Хмялеўскі, наадварот, усіх рассмяшыў жартоўнай байкай Кандрата Крапівы „Мандат" ды атрымаў найбольшыя апладысменты. Класна запрэзентаваліся ўзыходзячыя зорачкі дэкламатарскай сцэны — Магда Бабік і Юстына Апольская. Ёсць новая зорка — адметна запрэзентаваўся дашкольнік Філіп Хомік з беларускага прадшколля, якому камісія назначыла другое Гран-пры.

Калі ідзе пра аўтараў, творы якіх сёлета прагучалі са сцэны, дык тут таксама былі новыя прапановы. Аж чатырох гімназістаў выступіла з творам Надзеі Артымовіч. Гімназісты дэкламавалі таксама Якуба Коласа, Уладзіміра Караткевіча, Ларысу Геніюш, Алеся Камоцкага. Наймалодшыя дэкламатары — Галіноўскую, Панчанку, Вітку, Шушкевіча, Карызну, Маляўку, Шведа. Цікавае, што моладзь дэкламавала рэфлексіўныя і патрыятычныя творы.

У конкурсе прыняло ўдзел аж 107 дэкламатараў і амаль ніводзін верш не паўтарыўся.

* * *

Вынікі дэкламатарскага конкурсу „Роднае слова" ў Беластоку.

Камісія ў саставе Альжбета Фіёнік (старшыня), Яніна Плютовіч і Васіль Сегень назначылі пераможцаў.

У катэгорыі дашкольнікаў усе 11 дэкламатараў атрымалі вылучэнні і запрашэнне на цэнтральныя элімінацыі, якія адбудуцца 12 красавіка ў Нараўцы.

Гран-пры сярод наймалодшых атрымаў Філіп Хомік з беларускага прадшколля ў Беластоку.

У катэгорыі I-III класаў:

I месца — Якуб Андрацкі, Магдаліна Бабік, Юстына Апольская,

II месца — Бася Філіпюк, Ксеня Заброцкая, Дар'я Вапа, Патрыцыя Давідоўская,

III месца — Міхал Голуб, Юстына Варановіч, Дар'я Дажынка, Ася Гурская.

У катэгорыі IV-VI класаў:

I месца — Юстына Давідзюк, Лідзія Пякарская, Ніна Ваўранюк, Ігар Фралоў,

II месца — Кася Бількевіч, Крыстыян Бурнос, Паўліна Варановіч, Паўлік Варановіч,

III месца — Кжысь Літвін, Эвеліна Філіновіч, Патрыцыя Гаўрылка, Ганна Пякарская.

У катэгорыі гімназія:

Гран-пры атрымала Кася Кузьміч з Гарадка,

I месца — Наталля Швед,

II месца — Пётр Стэльмашук, Матфей Сэвастыянік, Наталля Кандрацюк-Свярубская,

III месца — Аляксандра Каліна, Наталля Рудчык, Міхал Хмялеўскі.

ЗОРКА

Гражынка і Грак

- 20 -

Прыйшоў ліст да бабулі. Дзіўная справа. Праўда, прыходзяць лісты ў паштовую скрынку Гражынчынай сям'і, ды гэта найчасцей толькі нейкія паведамленні з розных устаноў, бланкі аплат — за электраток, за ваду, на падаткі... Ну, яшчэ паштоўкі-адкрыткі — з нагоды розных свят, віншаванні гадавін ды імянін. Усе лістуюцца шляхам Інтэрнэту, а найпрасцей — пазваніць па тэлефоне ці нават камп'ютэры. Нават бабуля звыклася з новай тэхнікай. А тут — ліст, у блакітным канверце, папярэшчаны маркамі — крыху нават пажоўклы. Адрас такі ж, імя бабулі таксама, ды прозвішча ейнае яшчэ дзявочае. І як прыгожа хтосьці напісаў адрас — літаркі выведзены атрамантам, адна ў адну роўненькія, крыху пахіленыя ў правы бок. Можна падумаць, што бабуля сама пісала сабе ліст — гэтак і яна прыгожа піша. Застаўся такі почырк па ўроках чыстапісання ў школе. Такімі ж літарамі выведзены бабуліны школьныя пасведчанні, па-польску і па-беларуску на абодвух баках ліста. Гэтак пісаў іх класны выхавацель. А гэты ліст напісаў бабулін сябра Толік з пачатковай школы. А выслаў ён гэты ліст не ўчора ці заўчора, а... сорак гадоў таму!

— Пешшу дайшоў бы гэты ліст, калі б ішоў з лапы на лапу! — заглянуў Грак бабулі праз плячо на густа запісаныя старонкі. Нават уявіць не мог, што гэта такое — сорак гадоў. — Колькі гэта сорак?.. сарок?..

— Гэта ліст з мінулага стагоддзя, — сказала бабуля і пасвятлеў яе твар, быццам памаладзела на тыя „сорак сарок".

Грак прыгледзеўся бабулінаму твару. Яму такое ніколі не бачылася: на бледных бабуліных шчоках разліўся румянец.

— Ты... пачыр-р-рванела? Хор-р-раша!

Гражынка глядзела з-над кніжкі на бабулю. Цікава было спытацца, што напісаў ёй сорак гадоў таму калега. І чаму той ліст не прыйшоў тады, калі яго выслалі.

— Чаму ж гэты ліст не прыйшоў тады! — бабуля цяжка села на канапу. — Усё было б іначай!

Гражынка ўсунула далонь у кішэнь свайго школьнага рукзака. Там ляжаў нераспячатаны ліст ад аднаго хлопца з VI класа. Насіла яго там ужо... не сорак сарок, а толькі пяць дзён.

Міра Лукша

Мікола Хведаровіч

Пралеска

На сонечным узлеску
Апошні снег растаў.
Вясёлыя пралескі
Зірнулі з-пад куста.
Празрыста ззяюць вочы,
Нібы блакіт нябёс.
Халоднай весняй ноччу
Іх не кране мароз.
Пралескі на пагорку
Пад леташняй травой
Зіхочуць, быццам зоркі,
Агністай сінявой.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Галерэя „Зоркі" (Беласток)

Наталля Рудчык

Сярэдняя ацэнка на пасведчанні — 5,00.

Мая мянушка — Пімполь.

У жыцці хачу стаць, чаму — журналісткай або палітыкам. У будучыні хачу займацца справамі, якія маюць сувязь з Беларуссю і беларускай мовай. Такую магчымасць дае мне журналістыка і палітыка.

У сяброў цаню — шчырасць. Калі мяне спасцігаюць клопаты, самыя лепшыя сябры маюць мне дапамагчы. Я сябру магу сказаць усё, а ён (яна) зразумее мяне.

Не люблю — людзей самалюбных і такіх, якія выкарыстоўваюць іншых, а таксама памідораў.

Па-беларуску размаўляю — з бацькам, бабуляй, настаўніцай.

Мой любімы гурт — „Н.Р.М.", але гэта не ўсё. Вельмі мне падабаецца Ліцэй, а таксама гурт „Strachy na Lachy".

Каля свайго дому пасаджу — елку.

Тры Паўліны і Паўл

Ад трох дзён Паўл хадзіў як накручаны. На ўроках таксама пераўзыходзіў усе спадзяванні. За апошнія дні злавіў тры шасцёркі і сем пяцёрак. Паўл здзіўляўся поспехамі, хоць адчуваў у сабе касмічны прыток сілы і адкрытасці; раптам задачы па матэматыцы ці хіміі сталі яму простымі, гімназіст рашаў іх ужо на перапынку, каб не дурыць галавы ў хаце. Там чакалі яго іншыя захапленні. Вечарам Паўл выходзіў на балкон і сачыў за зоркамі. У гэтыя дні ён захацеў стаць астраномам. Думаў таксама пра Паўліну Ш.

— Якая яна баявітая, — думаў з любасцю пра сяброўку-шаманачку.

У класе прыкмецілі яго перамену.

— Ты патрабуеш дапамогі псіхолага, — дапікала яму Іголка. — Наша Роза Брык вылечыць цябе з гэтай эйфарыі!

Паўл толькі пацісну плячыма:

— Дзякуй за добрую параду. Напэўна пакарыстаюся.

Ён не пакрыўдзіўся на Іголку, ведаў яе характар і нават любіў яе жарты. Сам часта пасылаў сяброў у кабінет Розы Брык. У класе шырокім кругам абміналі кабінет псіхолага і натхнёна жартавалі з гэтай установы. Вінаватая сама Роза Брык. Яна не любіла, калі нехта абіваў ёй парогі і сушыў галаву праблемамі. Сваіх пацыентаў пасылала найперш па *бацькоўшчыну*, а пасля ў іх прысутнасці гаварыла толькі адзін сказ:

— Ваш сын — хам!

У выпадку дзяўчат мяняўся толькі канчатак непрыемнага назоўніка.

Вядома, зараз ніякія клапатлівыя справы не маглі папсаваць цуд-настрою, які ад трох дзён панаваў у класе. Эйфарыя распаўсюджвалася як зараза. Вось, Паўліна Ш. лётала па калідоры з развеянымі валасамі і спявала свае аўтарскія песні, ад якіх сябры заходзіліся ад смеху.

І ўсяму вінаваты „страшны" выпадак, які здарыўся ў час згаданага ўжо канцэрта.

(працяг будзе)

Арабінка

Польска-беларуская крыжаванка № 15

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 11: Поспех, склеп, баба, мост, фанат, неба, каліна, сані, бульба, на, дар, бурштын, во, марс, вада, ла, крапіва. Яслі, сава, ас, народ, кмен, лобі, п'еса, бал, опт, бура, курс, фалш, альт, нібыта, банан, тата, Лі, ластаўка.

Узнагароды, набор канвертаў, выйгралі: **Кася Тарасюк**, **Мартына Сакалоўская** з Дубін, **Паўліна Башун**, **Наталля Янцэвіч**, **Аня Анікіюк** з Чыжоў, **Агата Барэчка**, **Наталля Гаўрылюк**, **Аня Кунцэвіч** з Нараўкі, **Агнешка Анікіюк** з Нарвы, **Паўліна Чурак з Гайнаўкі**.

Віншуем!



Аблога крэпасці

Размова з лідэрам беларускай аб'яднанай апазіцыі, апошнім часам кандыдатам на прэзідэнта Беларусі Аляксандрам МІЛІНКЕВІЧАМ.

— Чаго цяпер, пасля быццам бы перамогі Аляксандра Лукашэнкі, можа спадзявацца Беларусь з боку яго рэжыму?

Аляксандр Мілінкевіч: — Яны аб'явілі, што перамаглі, але наша краіна ўжо цяпер зусім іншая. Калісь людзі пападалі ў дэпрэсію, а цяпер яны, а іх большасць, ведаюць праўду і проста з усяго смяюцца. Улада страціла большасць сваіх прыхільнікаў. У сапраўднасці яны прайгралі. Маюць сваю міліцыю, КДБ і г.д., але, гледзячы на іх падтрымку грамадствам, не маюць шанцаў кіраваць краінай і яе развіваць. Мы перасталі ўжо рабіць мітынгі, бо большасць людзей адчайна нас падтрымлівае, а гэта каля 30-35 працэнтаў нашага грамадства. Варта прыгадаць, што да прэзідэнцкіх выбараў прыхільнікаў дэмакратычных сіл у Беларусі было ледзь некалькі працэнтаў. Мы пераходзім на іншы спосаб дзейнасці, засяродзіўшыся перш за ўсё на інфармацыі. Увесь рэжым трымаецца, бо ёсць інфармацыйная ізаляцыя, дамінуе прапаганда, якой займаюцца дзяржаўныя радыё і тэлебачанне. Мусім гэтаму супрацьставіцца, таму важна, каб дзейнічалі незалежныя радыё, тэлебачанне і мясцовыя газеты. Бярэмся за аблогу крэпасці.

— Чаго канкрэтна беларуская апазіцыя чакае ад Захаду?

— Гэта тры ўзроўні. Цяпер найважнейшае аказанне падтрымкі рэпрэсаваным асобам. Вялікую колькасць людзей звольнілі з працы і шмат студэнтаў выкінулі з вучэльняў. Звяртаемся да многіх краін, у тым ліку і да Польшчы, каб у першую чаргу падтрымаць маладых людзей пазбаўленых магчымасці вучыцца ў вышэйшых установах. Памагчы тым, хто страціў працу, цяжэй, але ж ёсць разнавідныя прыгранічныя праграмы, каб тыя людзі маглі зарабіць у Польшчы, на Літве, можа і ў Расіі. Без сумнення, аб гэтых людзях мы павінны дбаць, бо гэта найлепшая Беларусь. Дзякуем за падпісанне пагаднення рэктараў польскіх вучэльняў, якія гатовы прыняць выкінутых беларускіх студэнтаў. У найбліжэйшы час ставім на развіццё незалежных СМІ. Вядома, радыёстанцый, але таксама і спадарожнікавага тэлебачання транслюючага на Беларусь. Яно давала б магчымасць дастаўляць сапраўдную інфармацыю на ўсю тэрыторыю Беларусі. Чакаем таксама падтрымкі незалежным мясцовым газетам.

— Можаце сказаць пра лік арыштаваных, выкінутых з вучэльняў, рэпрэсаваных?

— Увесь час працуем над канчатковым вызначэннем гэтых лікаў. Гэта не толькі партыйныя актывісты, але і звычайныя людзі. Кожны дзень паяўляюцца новыя прозвішчы. Агулам лік рэпрэсаваных у час выбараў сягае больш за 1 200 асоб. Гэта затрыманыя міліцыяй і КДБ. Палова з іх сядзела або яшчэ сядзіць у турме. Больш за паўтысячы гэта студэнты. Кожная з тых асоб не мае магчымасці вярнуцца на працу ці на вучэльню. Гэтыя лікі могуць толькі расці.

— Вы ўспомнілі аб тым, чаго чакаеце з боку Захаду. А ці дэмакратычная апазіцыя ў Беларусі чакае чагосьці з боку Масквы?

— Мы размаўлялі з Масквой. Калі я стаў супольным кандыдатам апазіцыі на прэзідэнта, мы тры разы размаўлялі з маскоўскімі палітыкамі, хоць гэта не былі размовы на найвышэйшым узроўні, як у Еўропе, як у Польшчы ці ў Літве. Гэта, аднак, толькі пачатак. У Маскве пануе міф: калі не Лукашэнка, дык прыйдуць да ўлады антырасійскія сілы, нацыяналісты, фашысты. Сам Лукашэнка гэты міф увёў. Наша заданне — гэты міф звергнуць, бо гэта няпраўда. Расія з'яўляецца для Беларусі стратэгічным партнёрам. Ніколі, аднак, не будзем здраджваць свайму суверэнітэту, не будзем гандляваць нашай незалежнасцю. Беларусь, на думку нашай задзіночанай і дэмакратычнай апазіцыі, павінна быць незалежнай краінай. У гэтым плане не бачым сэнсу ў будаванні нейкай супольнай дзяржавы з Расіяй. Тым не менш, эканамічнае супрацоўніцтва з Расіяй мае для нас вялікае значэнне.

— Як мяркуеце, што гэта абазначае, што Аляксандр Лукашэнка перанёс дату сваёй прысягі, раней падаўшыся ў Маскву?

— Аляксандр Лукашэнка — у благім псіхічным стане. Ніколі не спадзяваўся такіх шырокіх пратэстаў. Ён цяпер прыгнечаны настолькі, што не ў змозе сарганізаваць уласнай інаўгурацыі. У Маскве таксама вагаюцца, ці ён, як прэзідэнт чарговага тэрміну, мае ў Беларусі сапраўды такую вялікую грамадскую падтрымку, бо аж больш за 80 працэнтаў. Ведаю напэўна, што ў Мінску ён абсалютна выбары прайграў. Я атрымаў 57%, ён значна менш. У першым туры ён без сумнення не перамог. Будучыня яго прэзідэнцтва ані для Масквы, ані для яго самога не такая надзейная. Інаўгурацыя прэзідэнцтва, вядома, будзе, але яе будучыня — не такая моцная як раней, улада не будзе такая самаўпэўненая.

— Навошта было апазіцыі падаваць у Вярхоўны суд заяву, аспрэчваючую вынікі прэзідэнцкіх выбараў?

— Каб мець добрае маральнае самаадчуванне. Мы не разлічваем на тое, што які-небудзь суд у Беларусі можа дайсці да якіх-небудзь вырашэнняў. Незалежных судоў даўно ў Беларусі няма. Робім гэта для саміх сябе і для грамадскай думкі ў краіне і за мяжой. Гэтая ўлада можа ўпасці толькі непасрэдна шляхам магутных вулічных акцый, дарэчы, як кожная дыктатура.

— Набліжаецца 20 гадавіна аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Для беларускай дэмакратычнай апазіцыі гэтая дата заўжды была сімвалам. Што плануеце ў гонар гэтай падзеі сёлета? Ці адбудзецца Чарнобыльскі шлях?

— Пасля чарнобыльскай катастрофы на Беларусі асадзілася 75% радыеактыўных забруджанняў. Не хочам з гэтай нагоды арганізаваць палітычных мітынгаў. Хочам гаварыць аб праблемах з гэтым звязаных, а што скрывае ад нас улада. Ад дзесяці гадоў не выдаюцца карты забруджанняў. Ёсць справы, аб якіх нельга думаць напаказ. Справа Чарнобыля — адна з іх.

— Дзякую за размову.

Размаўляў Мацей Халадоўскі

Спадчына А. Пяткевіча

У Мінску ў выдавецтве „Беларускі кнігазбор" выйшла нядаўна з друку кніга гродзенскага прафесара Аляксея Пяткевіча „Старонкі спадчыны". Кніга складаецца з артыкулаў, рэцэнзій і літаратурных партрэтаў, якія былі напісаны навукоўцам у апошнія гады. Выданне сур'ёзнае, цікавае і вартае ўвагі тых, хто цікавіцца нашай гісторыяй, літаратурай і культурай. Не засталіся ў гэтай кнізе па-за ўвагай нашага вядомага даследчыка і знатныя постаці Беласточчыны. З цікавасцю чытаецца артыкул у кнізе пра Гродзенскі гурток беларускай моладзі і Сакольшчыну. Сапраўды, такі гурток працаваў у Гродне ў 1909-1914 гадах. Яго сябры на сваіх сходах, як піша аўтар кнігі, ладзілі традыцыйныя для таго часу грамадска-культурныя акцыі: ставілі спектаклі на роднай мове, дэкламавалі вершы беларускіх паэтаў, прэзентавалі музычныя праграмы і г.д. Найбольшую цікавасць праявіла ў працы гуртка, склала, па сутнасці яго патрыятычна-творчае ядро група гімназістаў і школьнікаў, якія паходзілі з Сакольскага павета. Сярод іх — Зоська Верас, Францішак Грынкевіч, Адам Бычкоўскі, Язэп Лявіцкі, Адольф Зянюк, Вінцук Семяновіч, Антон Спявак, Фэлька Лабенец, Янка Чарапук, Пранук Эйсмант і іншыя. Пра ўсіх іх можна пісаць цэлыя манаграфіі. Гэта былі вельмі таленавітыя людзі, шчырыя беларусы, якія моцна любілі сваю Бацькаўшчыну. З Новага Двара быў родам Фэлька Лабенец, які пісаў вершы і на вечарынах іх любіў чытаць. У 1918 годзе, па словах Аляксея Пяткевіча, „пайшоў у Саветы і там прапаў". Паэт Язэп Лявіцкі (літаратурны псеўданім Юрка Снапко) нарадзіўся ў 1893 годзе на хутары Горны Хлеўск Сакольскага павета. Скончыў Гродзенскую мужчынскую гімназію. Вучыўся на прыродазнаўчым факультэце Пецярбургскага універсітэта, пасля — у ваенна-медыцынскай акадэміі. Першы верш „Доля сіроткі" быў надрукаваны ў гродзенскім часопісе „Педагогическое дело" ў 1911 годзе. Друкаваўся таксама ў іншых выданнях. Памёр ад тыфу ў 1916 годзе. Дарэчы, Язэпу Лявіцкаму Аляксей Пяткевіч прысвяціў і асобны артыкул, які мае назву „З кагорты пачынальнікаў". Ці не першае гэта даследаванне пра таленавітага паэта з Беласточчыны? Відаць, так. Адольф Зянюк (1895-1938) быў родам з Сухаволі. Скончыў юрыдычны факультэт Пецярбургскага універсітэта, а таксама ваенную акадэмію ў Кіеве. Выступаў на вечарынах у Браніслава Эпімах-Шыпілы з рэфератамі. У 1925 годзе рэдагаваў часопіс „Студэнцкая думка". Памёр у Вільні. Пра кожнага сакольскага беларуса згадвае аўтар кнігі, хаця ў Гродзенскім гуртку было некалькі дзесяткаў чалавек. Але, пэўна, ураджэнцаў Сакольшчыны было куды больш, чым згадвае Аляксей Пяткевіч. Дык хто ж будзе шукаць іх сляды?..

Сяргей Чыгрын

Першая сустрэча Буйнюка

Чытаючы вершы і аглядаючы здымкі маладога хлопца з Маліннік, мы рашылі з ім пазнаёміцца і запрасілі яго ў сваю школу. Наш госць запрашэнне прыняў. 20 сакавіка з самай раніцы з вялікім хваляваннем прыехаў у Гайнаўскі белліцэй.

Гайнаўка прывітала госця светлымі праменнямі сонейка, невялікім марозам і подыхам доўгачаканай вясны. Госць — Юрка Буйнюк — выявіў, што гэта яго першая аўтарская сустрэча і адтуль хваляванне.

Сустрэча адбылася ў чытальным зале школьнай бібліятэкі. Удзел прынялі вучаніцы і адзін вучань другіх класаў ліцэя, настаўнік беларускай мовы Ян Карчэўскі і настаўнікі-бібліятэкары: І. Ігнатовіч і Г. Іванюк. Крыху збянтэжаны Ю. Буйнюк у першай частцы сустрэчы зачытаў свае вершы. Гэта былі вершы са зборніка „Субота ў Малінніках", з іншых зборнікаў, а таксама творы яшчэ не друкаваныя і зусім свежанькія з апошніх тыдняў.

Публіка — дзяўчаты ўслуханыя, зачараваныя. Хлопец малады, харошы, прыстойны, голасам аддае настрой твораў. Яго слухаецца добра.

Так мінуў адзін урок. Пасля перапынку час на пытанні і размову. Пытанняў было многа. Яны краналі і твораў, і самой асобы Буйнюка. На кожнае пытанне аўтар даваў вычарпальны адказ і таму можна было ад яго многа чаго даведацца і навучыцца. Галоўная інспірацыя яму прыходзіць тады, калі адчувае сябе самотным. Якраз слухачы вылавілі слова „самота", якое часта паўтараецца ў творах. Юрка Буйнюк піша на беларускай мове, але таксама і на гаворцы.

Першы верш напісаў ён у 1993 годзе. Гэта было пасля сустрэчы з Юркам Баенам — вядомым „белавежцам". Баена ў 1992 годзе наведаў школу ў Малінніках. Калі яго цёзка па імені купляў зборнік, той сказаў: „Ты будзеш пісаць вершы".

Юрка Буйнюк (у цэнтры) з вучнямі ліцэя

У 1994 г. за намовай настаўніцы беларускай мовы Юрка Буйнюк выслаў вершы ў „Ніву" і яны былі ўпершыню апублікаваны. Як кажа сам аўтар — ад таго часу пачалі цікавіцца ім журналісты. Будучы вучнем белліцэя ў Бельску-Падляшскім ён сябраваў з тымі, якія пісалі вершы. Утрымліваў сяброўскія кантакты з вучнямі з абодвух ліцэяў. Цяпер Юрка Буйнюк на 5-ым курсе беларускай філалогіі ў Беластоку. Будучы студэнтам пазнаў многа цікавых людзей, якія цесна звязаны з беларускім асяроддзем.

На яго творчасць вялікі ўплыў аказваюць творы М. Багдановіча і Р. Барадуліна. Любіць чытаць прозу І. Мележа, К. Чорнага, М. Гарэцкага. Падабаюцца яму В. Быкаў, любіць „белавежцаў", чытае Ю. Весялкоўскага. З польскай класікі чытае У. Тэтмаера, А. Асныка, Ю. Славацкага, Ц. К. Норвіда, М. Бялашэўскага. Прызнаўся, што не прападае за творчасцю Г. Сянкевіча, А. Міцкевіча ці С. Жаромскага.

Паэт вельмі любіць музыку, пераважна беларускую бардаўскую песню. Выявіў, што сам вучыўся іграць на гітары і хоча да гэтага вярнуцца. Зайздросціць Гайнаўцы таго, што ў ёй беларускі музей, што чуваць тут дух беларускасці.

Юрка быў на Беларусі, дзе вельмі многа людзей піша на беларускай мове, на жаль, кантактаў з імі не мае. Менавіта іх паэзія вельмі розніцца ад нашай. Хаця яна таксама вельмі сучасная.

— Сустрэча з Юркам Буйнюком сапраўды мне падабалася, — кажа Бася Трафімюк. — Цешыць, што такія маладыя людзі ўмеюць прыкмеціць прыгажосць свету, прыроды і перадаць гэта паэтычным словам. Спатканне было вельмі цікавае.

Басі найбольш падабаліся творы пра Маліннікі.

— Мы задаволены, што маглі пабачыць і пагаварыць, пазнаць таямніцы пісання ўласных твораў. Мне здаецца, што пасля гэтай сустрэчы некалькі асоб паспрабуе пісаць. Я пераканана, што свая творчасць дапамагае ўцячы ад акружаючага „бязлітаснага" свету, — сцвярджае Бася Трафімюк, якой верш „Хмара чорная з градам" быў, разам з вершамі Юркі Буйнюка, змешчаны ў зборніку „Вобразы думак", выдадзеным у 1999 годзе.

Анэту Астапковіч вельмі зацікавіў верш Юркі ад 16 лютага гэтага года, які яшчэ нідзе не друкаваўся.

— Я ганаруся тым, што пасля сустрэчы мы перакінуліся некалькімі словамі і я атрымала ксеракопію верша. Ягоная творчасць вельмі асабістая, чытаючы метафарычныя фразы адкрываеш прастату, а таксама вялікае значэнне штодзённых спраў і адчуваеш сваю з імі сувязь, — кажа Анэта.

— Нам вельмі прыемна, што мы мелі магчымасць пазнаць такога таленавітага маладога чалавека. Гэтая сустрэча адкрыла многа таго, чаго мы не ведалі на тэму пісання вершаў, — мяркуюць Анеля Ягадніцкая і Эвеліна Юрчук.

Сам паэт таксама быў захоплены. Цешыўся, што столькі прыгожых дзяўчат прыйшло на сустрэчу і ўсе былі такія зацікаўленыя. Ю. Буйнюк у будучыні хацеў бы звязацца з журналістыкай, прэсай, каб апынуцца ў беларускім асяроддзі. Жадаем поспехаў у гэтым напрамку, а таксама вялікіх удач у творчым і асабістым жыцці.

Ірэна Ігнатовіч
настаўнік-бібліятэкар

Польска-беларускія сувязі

„Значэнне польска-беларускіх літаратурных сувязей. Учора, сёння і заўтра" — пад такім загалоўкам у Беластоку была праведзена канферэнцыя, якую арганізавала Падляшская ваяводская бібліятэка імя Лукаша Гурніцкага разам з Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкай імя Яўфіма Карскага. Праект „Літаратура без падзелаў — паглыбленне літаратурна-культурнай повязі Беласточчыны і Гродзеншчыны" быў фінансаваны часткова са сродкаў Еўрасаюза ды праводзіўся пад патранатам Еўрарэгіёна Нёман. Яго мэта — наладжанне супрацоўніцтва ў галіне літаратуры ды абмен літаратурна-культурным вопытам Польшчы і Беларусі. У выніку маюць замацавацца супольныя літаратурныя традыцыі паміж лакальнымі групамі ў памежных рэгіёнах Беласточчыны і Гродзеншчыны. Літаратура, выставы і даклады маюць паказаць тое, што супольнае, будаваць зразуменне і талерантнасць паміж народамі. Плёнам праекта мае быць выданне дзвюх двухмоўных анталогій — „Вершы з-над Нарвы і Нёмана" (для дзяцей) і паэтычнай — „Гнёзды слоў, словы гнёзд" у перакладзе Віктара Шведа і Міры Лукшы ды канферэнцыйных матэрыялаў.

— Рыхтуючы сённяшняе спатканне, у запале размаітых дыягназаў, якія ўдзіраюцца ў апошні час у свядомасць грамадзяніна, пражываючага не толькі на ўсходзе Рэчы Паспалітай, якая сутрасаецца непакоем з другога боку мяжы, — пачаў канферэнцыю дырэктар Падляшскай бібліятэкі паэт Ян Леанчук, — мы хацелі б засяродзіць сваю ўвагу на добрасуседскіх кантактах, фактаў якіх наша гісторыя і гісторыя суседзяў фіксавала шмат. І да іх якраз усё часцей трэба вяртацца, каб знайсці адвечную дарогу прымірэння, па-за сістэмамі і іх какафоніяй ды балючым няраз мінулым. Трэба знайсці тое, што спалучала абодва народы, спаслацца на страфы нашых паэтаў, якія паэтычным хваляваннем перакрочвалі межы недаверу і неразумення. І гэта не далёкая, папахваючая нафталінам, пазітывісцкая прадпасылка. Будаваліся вякамі прастора нялёгкая — трывання ў суседстве, і будавання будучыні побач сябе, у адрозных не раз па этнічных, рэлігійных і грамадскіх прызнаках умовах.

Не хапіла выказванняў гродзенскіх партнёраў. Не прыехалі на канферэнцыю па розных прычынах Юрка Голуб (даклад „Роля літаратуры

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

і яе перакладаў у культурным збліжэнні народаў"), дырэктарка Навуковай бібліятэкі ў Гродне („Роля бібліятэк у культурным збліжэнні"). Аб нялёгкіх памежных кантактах, напоўненых надзеямі добрасуседскіх сувязей расказала прафесар Анна Сітарская, выдатная спецыялістка па інфарматычных працэсах, па выбару да 2002 г. ва універсітэце ў Беластоку, а па неабходнасці ў Ягелонскім. Даклад Яна Сянкевіча — віленскага гісторыка і журналіста, гадамі сардэчна звязанага з Беларуссю, часта кранаючага тэмы культурнага памежжа і ўзаемных, бывала, што складаных сувязей, выказаны чыстай крэсовай пальшчызнай меў загаловак „З Віленшчыны аб польска-беларускіх сувязях. Надзеі і рэчаіснасць" (размова з ім у наступным нумары). Тэрэса Яблонская падрыхтавала даклад аб літаратурных, перакладчыцкіх і культурных сувязях („Над словамі гнёзд — некалькі заўваг (прыватнай натуры) у сувязі з анталогіяй польска-беларускай паэзіі"), а прафесар Тэрэса Занеўская, цяпер кіраўнік гуманітарнага факультэта Галоўнай школы сельскай гаспадаркі ў Варшаве (выдала некалькі важных кніг пра беларускую літаратуру ў Польшчы) перадала для зачытання Іааннай Кайл свой змястоўны даклад „Супольнасць у культуры. Літаратурна беларуска-польскі век". Цэласць усіх спроб пошукаў „мастоў праз стагоддзі", прадстаўляючы перш за ўсе свае дзеянні, рэалізаваныя ў праектах м.інш. Еўрарэгіёна Нёман, прадставіла доктар Ядвіга Навацкая з Публічнай бібліятэкі ў Сувалках у дакладзе „Роля бібліятэчных асяроддзяў у фармаванні культурных з'яў злучаючых абодва народы". Доктар Навацкая ўжо правяла падобнае міжнароднае мерапрыемства („Пошукі супольных польска-беларускіх каранёў") на Віграх, і плён канферэнцыі быў апублікаваны па-польску і... па-руску (Ян Леанчук у знак пратэсту свой даклад прачытаў быў там, як умеў, па-беларуску, так, як ведаюць гэтую мову пад Заблудавам...).

Анталогіі і зачытаныя на канферэнцыі матэрыялы будуць прадстаўлены 26 красавіка, у Сусветны дзень паэзіі.

Міра Лукша

Беларусам, пры ўсёй незразумелай іх сучаснасці, пашанцавала з мінулым. Праўда, ставіцца беларуская большасць да сваёй гісторыі абыякава...

http://etna.of.by

Сіла кожнага народа ў яго культуры і гісторыі. Сучаснае часцяком не ўспрымаецца людзьмі як нейкая прыналежнасць менавіта да сябе. Погляд на цяперашняе разбягаецца на дробязі, за якімі не бачна вечнага. Беларусам, пры ўсёй незразумелай іх сучаснасці, пашанцавала з мінулым. Праўда, ставіцца беларуская большасць да сваёй гісторыі абыякава, але зважаць на такі стан рэчаў трэба згодна кітайскай прымаўкі: „Жамчужына, нават у руках дурня, не перастае быць жамчужынай". А тое, што беларуская гісторыя гэта сапраўды жамчужына, лёгка пераканацца, зазірнуўшы на http://etna.of.by — сайт Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту.

Першая старонка сайта зроблена адрозна ад большасці сайтаў. Адрозненне заключаецца ў нейкім спакойна-добразычлівым выпраменьванні, якое зыходзіць ад яе. Ідзе яно не столькі ад аздаблення старонкі — яно даволі сціплае, а ад тых слоў, якімі сустракае цябе гэтае віртуальнае прадстаўніцтва музея: „У маляўнічым наваколлі Менска, там, дзе зліваюць воды ціхаплынная Пціч і гістарычна вядомая Менка, пад адкрытым небам ствараецца ўнікальны музей-запаведнік. Ва ўтульным рэчышчы, сярод тальвегаў і пагоркаў паўстаюць помнікі народнага дойлідства з розных гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі. Тут, побач з гарадзішчам на Менцы, знітаваўшыся ў адзіным асяродку святынь гісторыі і культуры зямлі прашчураў, яны павінны набыць новае жыццё". Як далей паведамляецца, у аснову навукова абгрунтаванай структуры экспазіцыі пакладзена раяніраванне матэрыяльнай культуры беларусаў, у адпаведнасці з якім тэрыторыя рэспублікі падзяляецца на наступныя рэгіёны: Паазер'е, Падняпроўе, Цэнтральная Беларусь, Усходняе і Заходняе Палессе, Панямонне. Асобна прадугледжаны сектары „Мястэчка" і „Унікальныя помнікі".

Але далейшая вандроўка па сайце яшчэ раз прымушае нас сутыкнуцца з прыкрым стаўленнем беларусаў да сваёй гісторыі. Нягледзячы на тое, што рашэнне аб стварэнні музея было прынята яшчэ ўрадам БССР акурат 30 гадоў таму, да гэтага часу існуюць толькі экспазіцыі Паазер'е, Падняпроўе і Цэнтральная Беларусь. Прычым дзве першыя ў фрагментах. Але на сайце мы можам падрабязна пазнаёміцца з імі, бо кожная мае асобную старонку. Там размешчаны не толькі фотаздымкі экспанатаў, але і цікавыя расповеды. Нават гэтая кропля інфармацыі аб архітэктуры і побыце нашага народа захопіць, бадай, кожнага.

З першай старонкі можна прайсці на падрубрыкі „Гісторыя музея" і „Водгукі". Таксама і на іншыя старонкі, выйсці да якіх месцяцца ўверсе пад назвай сайта.

Цікава зроблена рубрыка „Экспазіцыі". Яна змяшчае карту, якая з'яўляецца толькі тады, калі на яе навядзеш „мышкай". У якасці падрубрык унізе размешчаны выйсці да трох вышэйзгаданых экспазіцый.

Старонка „Паслугі" ўтрымлівае ў сабе тры падрубрыкі „Музейныя заняткі", „Аглядавыя экскурсіі" і „Тэматычныя экскурсіі". Усе яны вельмі падрабязна распісаныя і колькасць іх уражвае — кожная змяшчае да сямі разнастайных музейных вандровак і лекцый. Больш таго, „Музейныя заняткі" разлічаныя да малодшых школьнікаў, якім, магчыма, пашчасціць упершыню сутыкнуцца з гісторыяй бацькаўшчыны ў музеі пад адкрытым небам.

Уладзімір Лапцэвіч

Выхаванец віцебскай школы боксу Сяргей Ляховіч стаў чэмпіёнам свету ў суперцяжкай вагавай катэгорыі паводле версіі WBO...

Беларусь, беларусы...

Першы тытул Белага Ваўка

У ноч з 1 на 2 красавіка адбылася гістарычная для беларускага спорту падзея. Выхаванец віцебскай школы боксу Сяргей Ляховіч стаў чэмпіёнам свету ў суперцяжкай вагавай катэгорыі паводле версіі WBO. Як прыкра, што айчынныя заўзятары не маглі пабачыць трансляцыю гэтага паядынку.

30-гадовы Ляховіч пасля пераходу з аматарскага ў прафесійны бокс ужо даўно жыве і трэніруецца ў ЗША. Год таму яго апекуном стаў легендарны Дон Кінг, які вядомы ў свеце боксу з аднаго боку шматлікімі скандаламі, а з іншага, звышталентам у арганізацыі найцікавейшых відовішчных баёў на прафесійным рынку. Вельмі хутка ён здолеў арганізаваць матч за тытул і для свайго новага падапечнага. І ўжо з першай спробы Белы Воўк (такая мянушка ў беларускага суперцяжа) здолеў стаць новым чэмпіёнам, адолеўшы ў Кліўлендзе чатырохразовага ўладальніка запаветнага паса амерыканца Лэймана Брустэра.

Сяргей Ляховіч яшчэ юнаком падаваў вялікія надзеі, але на аматарскім роўні яму не ўдалося заваяваць сусветную вядомасць. У 1996 годзе выхаванец віцебскага трэнера Анатоля Колчына (для даведкі: у ліку яго вучняў таксама Віктар Зуеў — сярэбраны прызёр апошняй алімпіяды) на першынстве Еўропы ў Данії дайшоў да чвэрцьфіналу. На алімпійскіх гульнях у Атланце ў тым жа годзе Ляховіча спасцігла фіяска — ён „выляцеў" ужо ў першым крузе. У 1997 годзе стаў бронзавым прызёрам чэмпіянату свету ў Будапешце, але далейшай рэалізацыі патэнцыялу не было. Пасля пераезду за акіян пра таленавітага хлопца доўга не было чуваць. Але спакваля ён прасоўваўся ў эліту. У 2005 годзе ў сустрэчы з Оўэнам Бекам Ляховіч атрымаў траўму, якую давялося доўга залечваць.

Чорнаскуры Лэйман Брустэр шырокую вядомасць набыў пасля таго, як у 2004 годзе здолеў накаўтаваць украінца Уладзіміра Клічко ў баі за чэмпіёнскі пас па версіі WBO. Трэба заўважыць, што ў свеце існуе некалькі прафесійных баксёрскіх асацыяцый. Найбольш прэстыжныя з іх WBC, IBF, WBA і WBO. Дык вось перад боем з Брустэрам у рэйтынгу па версіі WBC Ляховіч займаў 12-е месца, па версіі IBF — 9-е, а па версіі WBO меў 13-ю пазіцыю. Якой асацыяцыі чэмпіёнскі тытул найбольш прэстыжны, сказаць цяжка. Таксама як і вызначыць, хто на сёння самы моцны баксёр свету. Найлепшы ў абсалютнай катэгорыі, на маю думку, у апошнія пяць гадоў быў адзін з братоў Клічко — Віталь, але зусім нядаўна з-за праблем са здароўем ён адмовіўся ад абароны свайго чэмпіёнскага тытулу і пакінуў прафесійны рынг. Цяпер Віталь Клічко — прыкметная фігура ўкраінскай палітыкі. Чэмпіёнам WBC ёсць Хасім Рахман, WBA — Мікалай Валуеў (расійскі гігант па мянушцы Кінг-Конг), IBF — Крыс Бёрд. У сумарным рэйтынгу найвышэй стаіць Уладзімір Клічко.

Першы чэмпіёнскі пас дастаўся Ляховічу зусім няпроста. У сёмым раундзе Белы Воўк быў змушаны нават стаць на калена. Але наш баксёр вядомы тым, што за сваю кар'еру толькі тройчы трапляў у накаўт (гэта з улікам звыш 150 аматарскіх баёў). У дзевятым раундзе перавага Сяргея была ўжо відавочнай і несумненнай. Гэта падкрэслівае і той факт, што пасля заканчэння 12-раундавага паядынку ўсе тры арбітры аддалі перамогу беларусу.

Уладзімір Хільмановіч

Згрызоты сумлення

Як толькі, зрабіўшы колькі простых матэматычных падлікаў са школьнай праграмы, Анатоль зразумеў, што за кратамі сяброў стала нашмат больш, чым на волі, у яго не засталося сумненняў, што і ён вельмі хутка папоўніць спіс людзей на нарах. Яго ўпэўненасць яшчэ ўзмоцнілася пасля таго, як з рэгіёнаў сталі прыходзіць звесткі, што міліцыя хапае апазіцыянераў дзе толькі ўбачыць: на працы і каля хаты, на вуліцы і на вакзалах, пабедаўшых і галодных, трымаючых Вялікі пост і атэістаў. Пасля, правёўшы няхітрую працэдуру ў судзе, дзе суддзі спяшаліся абвясціць: „Вінаваты! Давайце наступнага!", супрацоўнікі праваахоўных органаў цягнулі няшчасных змагароў за праўду і справядлівасць да астрога, дзе тыя мусілі сустрэць дзень выбараў прэзідэнта, да якога так доўга рыхтаваліся.

Анатоль раскінуў трошкі мазгамі і вырашыў, што тыя некалькі дзён або гадзін, якія яму засталося правесці на свабодзе, ён мусіць пражыць так годна і варта, каб было што ўспамінаць у турме. Дастаўшы адмыслова схаваныя ад жонкі трыццаць пяць тысяч дзвесце дзесяць рублёў, ён скіраваўся ў бліжэйшую кнайпу, пастанавіўшы, што для хворага сэрца і падарванага адваротным спартыўнаму ладу жыцця здароўя будзе лепш, калі міліцыя забярэ яго ў безнадзейна алкагольным, цалкам адключаным ад невыносна-паскуднай рэчаіснасці стане.

Але ў міліцыі былі свае меркаванні. Таму апазіцыянера затрымалі на паўдарозе да кнайпы і цалкам цвярозага звінавацілі ў тым, што ён п'яны кідаўся на людзей, прытым брудна мацюкаўся, як грузчык з гродзенскага рачнога порта. Такое цынічнае абыходжанне перапаўняла сэрца Анатоля помстай, якую ён надумаўся здзейсніць над ілжэсведкамі адразу, як адсядзіць свае пятнаццаць сутак.

У такім помслівым стане Анатоль быў трое сутак. На чацвёрты дзень яго нечакана наведалі думкі пра сям'ю. Ён успомніў, што жанаты, мае дзяцей, родных, блізкіх... Як яны без яго? Сэрца сціснулася ад суму. Вось бы іх хоць на хвілінку ўбачыць. Адразу стала б лягчэй. Ды дзе там. Тут толькі халодныя нары, смярдзючая параша і ніякой сувязі з тым светам за сценамі астрога.

На сёмы дзень душу арыштанта агарнулі нязвыклыя згрызоты сумлення. Як ён няправільна жыве! Толькі тут, адарваны ад дурной, нікому непатрэбнай мітусні і палітыкі, што нішчыла душу, ён зразумеў, што ў пэўны момант яго жыццё пайшло не тым кірункам. У яго ж добрая, чулая, прыгожая жонка. Мілыя дзеткі. Жыць бы і радавацца. А ён, што? Вечныя пасяджэнні, мітынгі, арышты. Пасля, каб неяк выпаўзці са стрэсавага стану, п'янкі да поўначы. Сям'і сваёй амаль не бачыць. А жыццё ж адно. Трэба неяк цешыцца з таго найлепшага, што яно дало, і шанаваць тых, хто побач. Дарыць ім сваё цяпло і ласку, а не пераймацца нейкай помстай нейкім міліцыянтам. Хай гараць яны сінім агнём разам з усёй гэтай дурной палітыкай. Кідаць яе трэба.

Калі мінуў дзесяты дзень „адсідкі", Анатоль пераканаўся, што нарэшце зразумеў сэнс жыцця. Згрызоты сумлення, што жыў дагэтуль няправільна, дасягнулі піку. Цяпер ён усё зменіць. З працы дахаты будзе прыходзіць у час, нідзе не затрымвацца. Калі захочацца пайсці ў кнайпу, то толькі з жонкай. Ён будзе гуляць па горадзе з дзецьмі, а па выхадных выязджаць са сваёй сям'ёй на прыроду...

Дзверы камеры, зарыпеўшы як косці старога каня, павольна адчыніліся.

— Выходзьце, — роўным, пазбаўленым эмоцый голасам, прасіпеў міліцыянт. — Вы свабодны.

Пад апошнія каманды: „Проста", „Направа", „Тварам да сцяны" Анатоль павольна прасоўваўся па цёмным калідоры да так чаканай свабоды. Перад апошнімі дзвярыма, якія аддзялялі яго ад волі, арыштант атрымаў свае шнуркі, дзяжку, бел-чырвона-белы значок, ланцужок з крыжыкам, мабільны тэлефон і трыццаць пяць тысяч дзвесце дзесяць, так і непрапітых, рублёў. Ён выйшаў на вуліцу і адразу скіраваўся да групы сяброў, якія чакалі.

— Жыве Беларусь! — адказаў Анатоль на аналагічнае прывітанне і спытаў: — Як прайшлі выбары?

— Як заўсёды ўсё сфальсіфікавана.

— А людзі на плошчы сабраліся?

— Так. Акцыі пратэсту яшчэ ідуць у Мінску.

— Цудоўна! — павесялеў Анатоль. — Значыць заўтра зранку едзем у Мінск. А зараз хадзем у якую кнайпу. Трэба стрэс зняць. Ляснем па пару кілішкаў. Ды можа тых ілжывых міліцыянтаў сустрэнем, што мяне засадзілі на нары. Пазабіваю гадаў!

— А можа з'язджай спярша дахаты, — параіў хтосьці з прысутных.

У Анатолевым сэрцы штосьці кальнула. Нейкія незразумелыя смутныя пачуцці праляцелі па нацягнутых як струны нервах. Шалі душы завагаліся і на імгненне іх стрэлка спынілася пасярэдзіне. Але толькі на імгненне.

— Дахаты затэлефаную, — упэўненым голасам заявіў ён. — Як можна сядзець пад спадніцай у жонкі, калі такія падзеі. Дахаты завітаю пасля прыезду з Мінска. Калі зноў не арыштуюць.

Генрых Западашмянскі

Аднолькавыя страўнікі

Многа было крыку пра павышэнне пенсій у сакавіку 2006 года. Маёй жонцы прыслалі паведамленне аб так малой падбаўцы, што нават сорам прызнавацца. Да гэтай пары яна атрымлівала 507,46 зл. пенсіі, цяпер павысілі ўсяго на 27,72 злотаў. Як за такія грошы пражыць 73-гадовай жанчыне, калі штомесячна выдае яна ў сярэднім каля 200 злотаў на лякарствы? Апрача таго трэба купіць дровы ды аплаціць іншыя рахункі. Такая жанчына не купіць сабе кумпяка, рулета ці дарагой каўбасы, бо пры канцы месяца ёй не хопіць грошай на хлеб ды танную крывянку.

Раней ПіС, Ліга польскіх сем'яў і Самаабарона гучна заяўлялі аб патрэбе ліквідацыі пенсій г.зв. „старога партфеля", пераважна сялянам, бо вельмі малыя іхныя пенсіі. Калі ПСЛ атрымаў нізкую падтрымку ў парламенцкіх выбарах і перасталі з ім лічыцца іншыя палітычныя групоўкі, тады і сам Вальдэмар Паўляк перастаў змагацца за сялянаў. Потым Ліга польскіх сем'яў з Раманам Гертыхам на чале і Самаабарона з Анджэем Лепэрам падпісалі пагадненне з Правам і справядлівасцю і зноў яны забыліся пра ўсё, таксама пра людзей, якія апынуліся за рысай беднасці ды беспрацоўных. Яны толькі шукаюць віноўнікаў у тых групоўках, якія раней трымалі ўладу ў краіне. Тым часам на нашай палітычнай сцэне зноў адбыліся змены.

Калі ў выніку парламенцкіх выбараў адна палітычная групоўкая пяройме ўладу ад другой і будзе старацца яе знішчыць, а правіцеляў перадаць пад Трыбунал, то, трэба ведаць, праз некалькі гадоў не будзе каму кіраваць дзяржавай і ўсё пяроймуць чужаземцы. Падумайце, шаноўныя ўладары, каб не „прагулялі" нашай дзяржавы.

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

Яшчэ пра яўрэяў Беласточчыны

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Мілейчычы — сінагога ўнутры

Спасылаючыся на артыкул Міхала Мінцэвіча „Яўрэі на Беласточчыне" („Ніва" № 11), хочацца мне падкінуць нашым чытачам некалькі цікавых фактаў з даваеннага даведніка пра наша ваяводства, які выйшаў з-пад пяра д-ра Мечыслава Арловіча. У пачатку інфармацыі пра кожны большы населены пункт падае ён статыстычныя даныя (пераважна па выніках перапісу насельніцтва ад 1931 года) наконт нацыянальнага складу насельніцтва.

Ва ўсходняй частцы рэгіёна найбольш яўрэяў жыло ў Орлі (3 000 жыхароў і „амаль усе — яўрэі"), Сямятычах (4 200 яўрэяў на 7 800 усяго насельніцтва), Бельску-Падляшскім (38% яўрэяў на 8 000 насельніцтва) і Свіслачы (2 100 яўрэяў на 4 000 жыхароў). Але самы цікавы матэрыял пра гэтую нацыянальную меншасць змяшчаецца пры апісанні „шматлюдна наведванага лецішча" Мілейчычы, у якім на агульную колькасць 2 085 пастаянных жыхароў, яўрэяў было „толькі" 894 душ.

А вось што чытаем у даваенным даведніку: „Адно з самых вялікіх лецішчаў у паўднёвай частцы Беластоцкага ваяводства. Прысутнасць дачнікаў, пераважна яўрэяў, у апошніх гадах даходзіла да 1 500 чалавек за сезон з розных гарадоў, пераважна з Беластока, Бельска, Ваўкавыска і Сямятыч, часткова нават з Варшавы і Седльцаў. Для прыёму дачнікаў у суседнім лесе ўзнікла больш за 20 вілаў і пансіёнаў — разам больш за 200 пакояў. Кошт найму пакояў у сярэднім складае ад 25 да 30 злотых у месяц без абслугі і пасцелі. Летняй парой дзейнічаюць тут тры пансіёны — Хаіма Стрыкоўскага, Ізаака Розенцвага і Янкеля Сакалоўскага — у якіх можна таксама атрымаць абеды і вячэры. Апрача таго ў 1936 годзе былі тут дачныя вілы Зэльмана Сехана, Швейны Ойшпетэра, Бейлы Шымановіч, Шамкі Плотніцкага, Добы Байзнер і Шымана Карпа, Марыі Гусяцкай, Шлёмы Бірэнбаўма, Бафтула Залішанскага, Хаіма Вайнера, Альтэра Вайнера, Манеса Такарскага, Анны Кош".

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Мілейчычы — брама кіркута

Прыводжу я гэтую цытату поўнасцю, паколькі для сённяшняга чытача гучыць яна ўжо неяк экзатычна, а адзіным следам ад неіснуючага яўрэйскага насельніцтва Мілейчыч з'яўляецца пусты будынак сінагогі, які стаіць у цэнтры гэтага колішняга мястэчка і павольна руйнуецца. Ад дачных вілаў у лесе нічога не засталося.

А з другога боку можа варта падумаць, каб Мілейчычы зноў заняліся арганізацыяй летняга адпачынку, напрыклад, сем'ям з малымі дзяцьмі ці аматарам збірання грыбоў. Ад гэтага маглі б быць грошы для небагатых усё ж такі жыхароў гэтага мястэчка.

Марк ЦЫБАРТ

Супольнасць

На зломе сямідзесятых-васьмідзесятых гадоў Цэнтральная дырэкцыя ПКП актыўна ўдзельнічала ў жыллёвым будаўніцтве. Такім чынам узніклі рабочыя пасёлкі ў Гайнаўцы, Бельску-Падляшскім і Чаромсе. У гэтай апошняй пабудавана шэсць жылых карпусоў для чыгуначнікаў і два для афіцэраў камендатуры савецкіх войск. Памяшканні былі трох- чатырох- і пяціпакаёвыя з ваннай. У афіцэрскім блоку была адмысловая руская лазня.

Па законе службовыя кватэры прызначаліся найбольш патрабуючым сем'ям ды тым, хто не меў сваёй хаты. Рэчаіснасць была іншая. У каго былі „плечы", дык лічыўся панам. Атрымоўваў рэкамендацыю ў партыйнай і прафсаюзнай арганізацыі, ад мясцовых начальнікаў і завадскога камітэта партыі. А варта было падлізацца, паколькі месячная плата за кватэру складала сімвалічную залатоўку — на гэты час 30-45 зл. Пасля выводу савецкіх войск з Польшчы кватэры па афіцэрах прызначыліся чыгуначнікам. У рыначнай эканоміцы на чыгунцы змянілася кватэрная плата. Пачалі абавязваць гарадскія стаўкі за квадратны метр. Месячная плата за пяціпакаёвую кватэру сягала больш за трыста злотаў. Хто раней па блату атрымаў такое памяшканне, дык пачаў шукаць кліента, каб замяніць на меншае і менш плаціць. Але ахвотных не было.

Рабочы пасёлак складалі блокі ды драўляныя баракі, у якіх жылі больш за семдзесят сем'яў. У час мадэрнізацыі і рэструктурызацыі прадпрыемства — жылыя кватэры былі перададзены гміне. 1 чэрвеня 1999 года гміна арганізавала Прадпрыемства камунальнай гаспадаркі. У рабочым пасёлку насычальні па вуліцы Фабрычнай 43 сям'і выкупілі кватэры на ўласнасць. Дваццаць дзевяць сем'яў надалей належыць да Гміннай жыллёвай гаспадаркі. У гэтым жылым квартале жыльцы арганізавалі жыллёвую супольнасць, якую назвалі „Супольнасць блока н-р 13". Падобныя супольнасці арганізавалі ў пасёлку па вуліцы Школьнай — „Наш дом" і па вуліцы 1 Мая — „Цэнтрум". У кожнай супольнасці сваё праўленне і кааператыўны статут. У супольнасці „Наш дом" 32 сям'і выкупілі кватэры ў чыгуначнай адміністрацыі (на ўласнасць), а 10 належыць да гміннай камунальнай гаспадаркі. У супольнасці „Цэнтрум" — выкуплена 31 кватэра, 9 — лічацца гміннымі. Найменшыя стаўкі арэнднай платы абавязваюць у супольнасці „Цэнтрум" (па 0,77 зл/м²), у супольнасці „Наш дом" (1,10 зл/м²), а ў гмінных рэсурсах па 0,95 зл/м². Кватаранты чыгуначных блокаў пры выкупе памяшканняў карысталіся льготамі і плацілі ўсяго 5% вартасці кватэры. Для 19 сем'яў здзелка аказалася немагчымай. Таму надалей застаюцца адно кватарантамі гміннай камунальнай гаспадаркі.

Уладзімір СІДАРУК

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714
Накład: 1 700 egz.
Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Сакратар рэд.: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na III kwartał 2006 r. upływa 5 czerwca 2006 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na III kwartał 2006 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,50 zł, a kwartalnie — 45,50 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwar. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Połud. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

Студэнцкія дні беларускай культуры

6-7 красавіка 2006 г., кафэ „ФАМА" гадз. 18.00

чацвер 06.04.2006
рок-канцэрт: 5set5, RIMA, NEURO DUBEL
кошт квітка: 8 зл.,

пятніца 07.04.2006
Ілона Карпюк + сябры гурту „Rima", „RAHIS", Алег Кабзар.

Сардэчна запрашаем! Беларускае аб'яднанне студэнтаў

Мікалай Лук'янюк

Беларусы

Беларусы, беларусы,
Праваслаўныя сыны,
Што вы дрэннага зрабілі?
Да чаго край давялі?

Лукашэнка вамі правіць,
Хоць з тыранаў ён тыран,
Усё беларускае знішчае,
Сталінскі закон трымае.

Прабудзіцеся са сну,
З лукашэнкаўскай нядолі,
У свае рукі вазьміце
Лёс свой сваёй воляй.

Каб народ шчаслівы быў —
Трэба ўсім з'яднацца
І рэжыму Лукашэнкі
Ніяк не паддавацца.

Дзе Кастусь наш Каліноўскі?
Дзе магутна сіла,
Што калісь была ў народзе,
Моцай паланіла?

З поўначы, заходу, поўдня
Усе вас падтрымаюць,
Дабрабыту ды здароўя,
Усім вам жадаюць.

Ці Картуз-Бярозу
Хочуць вам стварыць,
За свабоду змагароў
Усіх туды ўсадзіць?

Не дамося мы, таму
Трэба нам з'яднацца.
За свабодную краіну
Дружна пазмагацца.

„Даўціпы" Андрэя Гаўрылюка

Між сяброўак:
— Не цярплю гэтай Кавальскай, яна мне дзейнічае на нервы!
— Мне таксама. А ты колькі ёй пазычыла?

* * *

Гутараць дзве сяброўкі:
— Мая дачка робіцца ўсё больш падобнай да мяне.
— І няма ад гэтага ніякага паратунку?

* * *

На будове:
— Кавальскі, — пытае брыгадзір, — чаму ты носіш па адной дошцы, а Новак па дзве?
— Бо ён гультай: не хочацца яму хадзіць двойчы.

Адгаданка



Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — прыказку.

1. „егіпецкая" опера Вердзі = 19 _ 21 _ 1 _ 14 _;
2. гора, галеча = 3 _ 25 _ 29 _ 30 _;
3. багіня зямлі ў старажытнагрэчаскай міфалогіі = 10 _ 6 _ 16 _;
4. шведскі порт на поўдні Батнічнага заліва = 24 _ 12 _ 31 _ 32 _;
5. навейшыя фасоны ўбораў = 15 _ 8 _ 7 _ 11 _;
6. усходняя страва, прыгатаваная з варанага ў авечым тлушчы рысу = 13 _ 20 _ 2 _ 9 _;
7. пчалінае сямейства = 4 _ 23 _ 33 _;
8. адсутнасць шуму, спакой = 17 _ 18 _ 26 _ 5 _;
9. муж чэшкі = 27 _ 28 _ 22 _.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 9 нумара

Барацьба, блюз, Буда, вата, дзед, дуга, іл, маца, цаца, цечка, цунамі, цыган, юань.

Рашэнне: **Дзеці балуюцца ад матчынага блінца, а разумнеюць ад бацькавага дубца.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Марыі Парэмбскай** з Гарадка і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

09.04 – 15.04

Баран (21.03. — 19.04.) Схільнасць да імпульсіўных паводзін а нават выбухаў агрэсіі, можаш пачаць змагацца за штосьці нічога нявартае. Рызыкні і заінвестуй, маеш шанц разбагацець (дарэчы, увесь месяц цікуе за табой немалая фартуна).

Бык (20.04. — 20.05.) Дзякуючы сябрам адчуеш, што жывеш. 12-15.04. могуць сустрэць цябе расчараванні. Можаш блага заінвеставаць ці спрабаваць падчапіць кагосьці, ад каго лепш трымацца здалёк.

Блізняты (21.05. — 21.06.) Можаш пераацаніць свае магчымасці і будзе табе здавацца, што над усім пануеш. Тым часам справы могуць вырвацца з-пад кантролю. Шмат спраў на працы — можа табе не хапаць часу. Распірае цябе энергія, ахвота да адважных вырашэнняў.

Рак (22.06. — 22.07.) Вялікія поспехі ў кампаніі, што можа не спадабацца хатнім. Энергія і ахвота да пераборшчвання ў фінансах. Пра інвестыцыі вырашай з паловы месяца.

Леў (23.07. — 22.08.) Энтузіязм, энергія. Можаш перамагчы ўсе перашкоды. Але трымайся за кашалёк, бо могуць чакаць цябе непрадбачаныя выдаткі. Старайся нічога не адкладваць, сумленна выпаўняй абавязкі, бо можаш пераплаціць.

Дзева (23.08. — 22.09.) Унутраны неспакой, спешка, раздражнёнасць; не вырашай важных спраў, не вядзі перамоў, калі залежыць табе на высвятленні спраў. Венера паможа табе знайсці чалавека, аб якім ты здаўна марыла.

Шалі (23.09. — 22.10.) Грошай вам хопіць, толькі трэба схіліцца. 12-15.04. не ўключайцеся ў падазроныя здзелкі, трымайцеся здалёк ад інтрыг на працы, бо можаце стаць іх ахвярай. У пары пазітыўныя змены.

Скарпіён (23.10. — 21.11.) Гарачы раман можа перакуліць твой свет. З размахам ажыццяўляеш свае ідэі. Можаш расчаравацца ў сябрах або не будзе іх тады, калі трэба. З кожнай кабалы вылузаюцца ўсе народжаныя паміж 5 і 12 лістапада.

Стралец (22.11. — 21.12.) Можаш прабудзіцца з пачуццёвага летаргу. Хтось з сям'і мае для цябе сенсацыйную вестку. 12-15.04. можаш быць нярады партнёрам. Ахвота здабыць грошы; гэта здзейсніцца, ды прыйдзецца пачакаць.

Казярог (22.12. — 19.01.) Падгоніш усе свае хвасты. У пачуццёвых справах гайданка — раз гарачая ласка, другі раз — шумныя скандалы. Радасць ад бацькоў. Зважай на зубы, пазваночнік. Не шалей за рулём.

Вадалей (20.01. — 18.02.) Каханне зваліцца на цябе як гром з яснага неба. Знакаміта ў інтарэсах. Але калі не задбаеш аб здароўе — з інтарэсаў можа быць пшык!

Рыбы (19.02. — 20.03.) Рассяваеце вакол сябе магнітную аўру. Краса, прыцягальнасць, ветлівасць. Размовы аб павышэнні адкладзіце на пасля. Да 10.04. магчымыя праблемы ва ўстановах і банках. Часовыя перашкоды з супрацоўнікамі; хтосьці схоча накінуць вам свае погляды, націскаць у нейкай справе.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960